Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 СНЕЖНЯ 2013 г. АЎТОРАК № 242 (27607) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

***Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Раство Хрыстовае 25 снежня***

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас з Раством Хрыстовым.

На працягу тысячагоддзяў Раство з'яўляецца сведчаннем перамогі духоўнага пачатку, крыніцай тварэння і натхнення. Гэта вялікае свята адорвае кожнага дзівосным прадчуваннем новага і цудоўнага, аб'ядноўвае людзей у высокіх думках і імкненнях.

У калядныя дні асабліва ярка адчуваецца значнасць і непарушнасць адвечных каштоўнасцяў, якія ляжаць у аснове чалавечага шчасця. Каляды — сямейнае свята, напоўненае цяплом хатняга ачага і любоўю блізкіх, дабром, радасцю і надзеяй.

Няхай дабрадатнае свята Раства азарае вашы дамы, дапамагае быць больш клапатлівымі адзін да аднаго, цаніць жыццё ва ўсіх яго праявах. І няхай мір і згода нязменна пануюць на роднай зямлі.

Ад усёй душы зычу вам моцнага здароўя, добрага настрою, удачы ў справах і пачынаннях.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

ЧЫРВОНКА

Чырвоная ічына



## Пякарская магія: хлебапечкі «адпачываюць»!




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## У КАЛЯДЫ НА КАЛЯДЫ

**«Гэй, гайда ў Каляды калядаваць!» — калісьці падобны кламбурны пакліч моладзі выглядаў цалкам дарэчна і актуальна. У вёску з сапраўдный святочнай назвай, якая знаходзіцца на Вілейшчыне, снежнымі вечарамі прыходзілі вясёлыя, пераапранутыя калядоўшчыкі з усёй ваколіцы. Гэта цяпер тут пануе цішыня і ўсе жылыя дамы рознакаляровай вёсачкі можна пералічыць на пальцах, аднак жыхары Калядаў актыўна рыхтуюцца сустрэць свята Божага Нараджэння. Як гэта адбываецца, на свае вочы пабачылі карэспандэнты «Звязды».**

Іосіф Браніслававіч Жураўскі, сын тамтэйшага солтыса, толькі-толькі вярнуўся з нядзельнага набажэнства ў даўгінаўскім касцёле і падпампоўвае кола ў сваёй чырвонай «пяцёрцы». На твары спадара Іосіфа, якога тут усе завуць проста Юзафам, добразычлівая ўсмешка. Яму ўжо за 80, але разам з жонкай ён яшчэ трымае кароўку, кабанчыка, час ад часу запрагае гожую кабылу Каштанку. З Аляксандрай Мікалаеўнай яны выгадавалі трох сыноў, згулялі залатое вяселле і рыхтуюцца да брыльянтавага! Амаль усё сваё жыццё Жураўскія прысвяцілі вёсцы са святочнай назвай і зусім не наракаюць на тое, як яно склалася. СТАР. 5

### ЛІЧБА ДНЯ

## Br3749,7 тыс. за месяц

*склалі грашовыя даходы на душу насельніцтва Беларусі ў студзені—кастрычніку. Агульны аб'ём грашовых даходаў насельніцтва склаў Br354,8 трлн. У іх структуры аплата працы займае 64,4 працэнта, даходы ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці, якая прыносіць даход, — 10 працэнтаў, пенсіі, дапамогі, стыпендыі і іншыя трансферты насельніцтву — 20,8 працэнта, даходы ад уласнасці і іншыя даходы — 4,8 працэнта. Рэальныя наяўныя грашовыя даходы ў студзені—кастрычніку гэтага года ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года павялічыліся на 17,2 працэнта.*

ISSN 1990 - 763X

## СТУК АПОЎНАЧЫ — ЕЗУС ПРЫХОДЗІЦЬ

### *Пастырскае пасланне Мітрапаліта Тадэвуша КАНДРУСЕВІЧА на Божае Нараджэнне 2013 года*

**Глыбокапаважаныя браты ў святарстве, кансэкраваныя асобы, браты і сёстры!**



Ізноў, як штогод, мы адзначаем радаснае і збаўчае свята Божага Нараджэння, калі дома ладзім ялінкі, купляем падарункі дзецям і спяшаемся да касцёла, каб у роздуме стаць каля ясляў, дзе знаходзіцца фігурка Немаўляткі Езуса. Менавіта гэтае слабое фізічна Дзіця стала наймацнейшым за магутных гэтага свету і адыграла непаўторную ролю ў жыцці чалавецтва, бо Яно — гэта доўгачаканы Збаўца.

Сёння мы становімся каля ясляў, каб падзякаваць Богу за такі вялікі дар Яго любові і ад Яго вучыцца такой любові, якая павінна абняць сучасны, поўны эгаізму, імкнення да ўзбагачэння любым коштам і поўны самазадаволенасці свет. Гэтая любоў яму патрэбна больш за ўсё. Яе адсутнасць з'яўляецца самым небяспечным крызісам, які вядзе ў сляпы завулак і які ўжо так моцна паразіў чалавецтва, што яно не ведае, як знайсці выйсце. А яно на самай справе ёсць — яно ў Езусе Хрысце і Яго любові да чалавека.

Гісторыя паўтараецца. Дзве тысячы гадоў таму чалавецтва таксама знаходзілася на мяжы самазнішчэння. Найлепшым прыкладам можа служыць Рымская імперыя, дзе панаваў прынцып «Хлеба і відовішчаў!», што на сучаснай мове можна акрэсліць як імкненне да багацця і задавальненняў. Менавіта гэты прынцып давёў яе да краху.

Тады, дзве тысячы гадоў таму, сярод цёмнай ночы граху апоўначы раздаўся стук. Гэта быў стук Марыі і Юзафа ў дзверы гасцініцы, каб знайсці месца, дзе мог бы нарадзіцца Збаўца свету. На самой справе гэта быў стук Бога ў дзверы чалавечага сэрца.

Хаця ў тыя часы яўрэйскі народ вызначаўся вялікай гасціннасцю і лічыў сваім абавязкам прыняць у дом кожнага падарожніка, тым не менш адказ на просьбу Юзафа быў адмоўны, хоць ноч была халодная. Яна была халодная фізічна, але перадусім халодная маральна, бо сэрцы людзей на просьбу прыняць цяжарную жанчыну ў свой дом казалі ёй рашучае «не». Такім чынам Марыі і Юзафу трэба было шукаць цяпла сярод жывёл. Нездарма кажуць, што чалавек можа быць настолькі жорсткім, што ўчыняе горш, чым жывёла. Парадокс — чалавек не прыняў Бога, а жывёлы прынялі... СТАР. 3

### Надвор'е

## НЕ ВАЛЁНКІ, А ПАРАСОНЫ

**І на гэтым тыдні пад уплывам Атлантыкі на тэрыторыі Беларусі захаваецца анамальна цёплае надвор'е, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

У аўторак на фоне павышанага атмасфернага ціску без істотных ападкаў. На асобных участках дарог слізка, а максімальная тэмпература паветра ўдзень — 2-7 цяпла. Даволі цёплае надвор'е чакаецца і 25 снежня — на каталіцкае Раство, калі будзе пераважна без ападкаў. Уначы на сераду ад мінус 2 да плюс 3 градусаў, удзень — 1-6 градусаў вышэй за нуль. На дарогах галалёдзіца. У чацвер і пятніцу праз нашу тэрыторыю пройдуць малаактыўныя атмасферныя франты, таму месцамі чакаюцца дажджы, зрэдку мокры снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 2 да плюс 3, удзень — 1-6 цяпла. Такі тэмпературны фон на 6-8 градусаў вышэйшы за норму.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, такое цёплае надвор'е і дажджы чакаюцца і ў суботу. А вось у нядзелю стане на некалькі градусаў халадней і ападкі чакаюцца ўжо ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — ад мінус 2 да плюс 4 градусаў. Сіноптыкі адзначаюць, што сёлета ў Беларусі гаспадарыць пакуль менавіта «еўразіма».



**Сяргей КУРКАЧ.**

# ДАЛЕЙШАЕ РАЗВІЦЦЁ ІНТЭГРАЦЫЙНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 24-25 снежня ў Маскве прыме ўдзел у пасяджэннях Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета і Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Плануецца, што на саміце 24 снежня прэзідэнты абмяркуюць пытанні далейшага развіцця інтэграцыйнага ўзаемадзеяння і падключэння да яго новых краін. У цэнтры ўвагі будзе ход работы над праектам дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе.

Акрамя таго, у парадак дня пасяджэння ўключаны пытанні, якія датычацца кантролю за выкананнем правіл канкурэнцыі, дзейнасці суб'ектаў натуральных манаполій. Плануецца зацвердзіць бюджэт Еўразійскай эканамічнай камісіі на 2014 год.

На пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы 25 снежня плануецца разгледзець асноўныя пытанні беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў розных сферах.

Парадак дня мерапрыемства ўключае больш як дзесяць пунктаў. Яны датычацца гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва дзвюх краін, бюджэту Саюзнай дзяржавы на 2014 год, праграмы ўзгодненых дзеянняў у галіне знешняй палітыкі, забеспячэння роўных правоў грамадзян у сацыяльнай сферы, узаемадзеяння ў галіне культуры, падрыхтоўкі да святкавання ў 2014-2015 гадах 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

# НАВІНЫ ЗАЎСЁДЫ «МАЛАДЫЯ»

**У вядучага інфармацыйнага агенцтва краіны юбілей. 95 гадоў запар Беларускае тэлеграфнае агенцтва фіксуе штодзённую гісторыю дзяржавы. За гэты час у архіве кампаніі сабраліся мільёны тэкставых матэрыялаў, тысячы фотакартак. Самыя ўнікальныя з іх можна пабачыць на выставе «Гісторыя Беларусі ў фотаздымках фотакарэспандэнтаў БелТА».**





Дырэктар БелТА Дзмітрый ЖУК дэманструе ўнікальныя фотаздымкі першаму намесніку кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандру РАДЗЬКОВУ і міністру інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алегу ПРАЛЯСКОЎСКАМУ.

Амаль цэлае стагоддзе журналісты і фотакарэспандэнты галоўнага айчыннага інфармацыйнага агенцтва становяцца сведкамі важных падзей у краіне. Пасяджэнні ўрада, парламента, нацыянальныя святы, народныя гулянні, культурныя і спартыўныя мерапрыемствы — усё гэта нязменна фіксуецца супрацоўнікамі БелТА і захоўваецца ў архівах агенцтва: раней — стосамі фотакартак на паліцах, цяпер — гігабайтамі электроннай інфармацыі на камп'ютарных сэрверах. Кожны з іх — унікальная старонка з кнігі пра беларусаў.

На ўрачыстай цырымоніі адкрыцця выставы першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандр Радзькоў перадаў віншаванні супрацоўнікам агенцтва ад Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі, выказаў асабістыя ўражанні пра карысную працу журналістаў і фотакарэспандэнтаў кампаніі.

— Ад працы БелТА сёння залежыць вельмі многае, — упэўнены Алег Праляскоўскі, міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь, які ведае дзейнасць агенцтва знутры: у пачатку 2000-х ён з'яўляўся яго генеральным дырэктарам. — Адна з галоўных функцый агенцтва — інфармаванне абласных і раённых СМІ, данясенне да іх лаканічнай дакладнай інфармацыі.

Архівы БелТА — гэта ўнікальная беларуская гісторыя ў савецкія часы, жыццё народа ў перыяд перабудовы, кадры станаўлення Беларусі як суверэннай дзяржавы, адлюстраванне важных падзей сучаснай незалежнай краіны.

**Любоў БЯЛЯЕВА. Фота аўтара.**



■ Будзь у курсе

# У МЕНТУЗА — НЕРАСТ

**З 25 снежня ў Беларусі ўстанаўліваецца забарона на лоўлю звычайнага ментуза. Гэта звязана з пачаткам нераставання ў гэтага віду. Нерасціцца мянтуз пачынае пры тэмпературы вады, блізкай да нуля, ікру адкладвае пад лёдам.**

Мянтуз — адзіны прадстаўнік сямейства трасковых у прэсных водах. У Беларусі ён жыве ў басейнах Заходняй Дзвіны, Нёмана, Заходняга Буга, Дняпра, Сажа, Прыпяці, у азёрах Браслаўскай і Нарачанскай груп. Аддае перавагу чыстым вадаёмам з камяністым дном і халоднай крынічнай вадой.

У Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь нагадалі, што перыяд забароны на лоўлю звычайнага ментуза будзе доўжыцца да 28 лютага. Яго незаконны вылаў у гэты час з'яўляецца адміністрацыйным правапарушэннем, за здзяйсненне якога прадугледжана адказнасць у выглядзе штрафу — ад 10 да 50 базавых велічынь. Акрамя таго, парушальнік павінен пакрыць нанесеную прыродзе шкоду ў трайным памеры — 9 базавых велічынь за кожную асобіну. Калі сума шкоды складае звыш 40 базавых велічынь, наступае крымінальная адказнасць.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Ну і ну!

# КРУТОЕ ПІКЕ



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Можна сцвярджаць, што вадзіцель вялізнай фуры, якая пацярпела аварыю ў пяцідзесяці кіламетрах ад Мінска, нарадзіўся пад шчаслівай зоркай. Яго аўтамабіль страціў кіраванне і абрынуўся з вышыні моста на аўтадарогу ўнізе. Нягледзячы на такое смяротнае пікіраванне, сам вадзіцель не пацярпеў.

# НАЙМАЛЬНІК ЗМОЖА ПРАВЕРЫЦЬ РАБОТНІКА НА АЛКАГОЛЬНАЕ АП'ЯНЕННЕ

**З 25 студзеня 2014 года ўступае ў сілу закон «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове працы». Сярод навацый закона — замацаваная норма, якая тычыцца таго, што работнік абавязаны клапаціцца пра асабістую бяспеку і асабістае здароўе, а таксама пра бяспеку навакольных у працэсе выканання работ або падчас знаходжання на тэрыторыі арганізацыі. Таксама ўведзены інстытут акрэдытацыі юрыдычных асоб (індывідуальных прадпрымальнікаў) на аказанне паслуг у галіне аховы працы. Прадугледжваюцца дадатковыя магчымасці наймальніка ў частцы арганізацыі аховы працы і ажыццяўленні кантролю за выкананнем заканадаўства ў гэтым напрамку.**

У прыватнасці, як заявіў падчас анлайн-канферэнцыі на сайтах Мінпрацы і сацыяльнай абароны і БЕЛТА **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Ігар СТАРАВОЙТАЎ**, заканадаўча замацаваны абавязак працадаўцы праводзіць абавязковы медагляд перад працоўнай зменай з мэтай памяншэння траўматызму і забеспячэння бяспекі працоўных. «Як паказвае практыка, гэтая працэдура займае ад 2 да 5 хвілін», — сказаў намеснік міністра.

Таксама, пачынаючы з 25 студзеня, наймальнік мае права праводзіць агляд работніка ў працэсе працы — у выпадках, калі ёсць дастатковыя падставы думаць, што той знаходзіцца ў стане алкагольнага, наркатычнага або таксічнага ап'янення.

У выпадку адмовы работніка ад праходжання медагляду перад зменай або ў працэсе працы наймальнік абавязаны не дапускаць яго да выканання працы ў адпаведны дзень (змену). За перыяд адхілення заработная плата не выплачваецца.

❑❑❑

Канкрэтны пералік работ (прафесій), дзе работнікі абавязкова праходзяць медыцынскі агляд перад зменай альбо агляд на прадмет знаходжання ў стане алкагольнага, наркатычнага ці таксічнага ап'янення, сфарміраваны Міністэрствам працы і сацабароны. У гэты пералік, у прыватнасці, уключаны асобы, якія кіруюць транспартнымі сродкамі і грузапад'ёмнымі механізмамі, шэраг прафесій горназдабыўной прамысловасці, работнікі будаўнічай галіны. Усяго пералік налічвае каля 100 прафесій.

**Святлана БУСЬКО.**

## ПЫТАННІ НАМЕСНІКУ МІНІСТРА

***— Ці мае права работнік адмовіцца прыступіць да працы пры адсутнасці ў яго сродкаў індывідуальнай аховы? У гэтым выпадку ці будзе наймальнік абавязаны кампенсаваць работніку недаатрыманы заробак?***

— Работнік мае права на адмову ад выканання даручанай работы ў выпадку ўзнікнення непасрэднай небяспекі для жыцця і здароўя яго і навакольных да ліквідацыі гэтай небяспекі, а таксама пры непрадастаўленні яму сродкаў індывідуальнай аховы, якія непасрэдна забяспечваюць бяспеку працы. Пры адмове ад выканання даручанай работы па названых падставах работнік абавязаны неадкладна пісьмова паведаміць працадаўцу альбо ўпаўнаважанай службовай асобе наймальніка аб матывах такой адмовы, і далей падпарадкоўвацца правілам унутранага працоўнага распарадку, за выключэннем выканання вышэйзгаданай працы.

Што тычыцца аплаты, то ў выпадку невыканання нормаў выпрацоўкі не па віне работніка яго заработная плата не можа быць ніжэйшай за 2/3 тарыфнай стаўкі (акладу).

***— У якіх выпадках наймальнік абавязаны забяспечваць работнікаў спецвопраткай і за чый кошт?***

— Наймальнік абавязаны прадастаўляць работнікам, занятым на работах са шкоднымі і (або) небяспечнымі ўмовамі працы, а таксама на работах, звязаных з забруджваннем і (або) тых, якія выконваюцца ў неспрыяльных тэмпературных умовах, неабходныя сродкі індывідуальнай аховы ў адпаведнасці з вызначанымі нормамі.

### Дарэчы

*На пачатку 2013 года налічвалася 759576 працоўных месцаў са шкоднымі і (або) небяспечнымі ўмовамі працы. Найбольшая колькасць працоўных месцаў са шкоднымі і (або) небяспечнымі ўмовамі працы (ад агульнай колькасці рабочых месцаў са шкоднымі і (або) небяспечнымі ўмовамі працы) — у арганізацыях, падпарадкаваных Мінпраму, Мінэнерга, Мінбудархітэктуры, Мінсельгасхарчу, канцэрну «Белнафтахім».*

■ «Нашы дзеці»

# ПАДАРЫЛІ РАДАСЦЬ

**На свяце, якое адбылося ў Шклоўскай школе-інтэрнаце для дзяцей з парушэннямі зроку, пабывалі прадстаўнікі кіраўніцтва Магілёўскай вобласці на чале з губернатарам Пятром РУДНІКАМ.**



Фота БЕЛТА.

Сустрэча адбылася ў рамках акцыі «Нашы дзеці».

Ад імя аблвыканкама Пётр Руднік падарыў школе-інтэрнату прынтар Брайля для друку рэльефнага тэксту на адмысловай паперы і 3 партатыўныя відэапавелічальнікі. Акрамя гэтага, кіраўніцтва вобласці дапамагло абсталяваць працоўнае месца дэфектолага, набыўшы неабходны для гэтага камп'ютар з мультымедыйным сэнсарным экранам і праграмным забеспячэннем. З наваговднімі святамі дзяцей і іх настаўнікаў павіншавалі таксама кіраўнік галоўнага ўпраўлення Нацбанка па Магілёўскай вобласці Раіса Лычкоўская, старшыня Паралімпійскага камітэта Беларусі Алег Шэпель, старшыня Шклоўскага райвыканкама Аляксандр Бойка.

Настаўнікі і іх выхаванцы, у сваю чаргу, правялі азнаямленчую экскурсію для ганаровых гасцей і прадэманстравалі работу рэсурснага цэнтра, дзе можна было пабачыць, якіх вынікаў дасягнула школа ў выкарыстанні электронных сродкаў навучання. А потым свята каля навагодняй ёлкі: хлопчыкі і дзяўчаткі ў яркіх карнавальных касцюмах спявалі песні і чыталі вершы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Фота БЕЛТА.



# СТУК АПОЎНАЧЫ — ЕЗУС ПРЫХОДЗІЦЬ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Тут дарэчы ўспомніць словы Святога Пісання з Паслання прарока Ісаі: «Вол ведае гаспадара свайго, і асёл яслі гаспадара свайго; а Ізраіль не знае Мяне, народ Мой не разумее» (Іс. 1, 3). Або словы Евангелля: «У свеце было (Слова), і свет праз Яго стаўся, і свет не пазнаў Яго. Да свайго прыйшло, і сваё Яго не прынялі» (Ян. 1, 10-11).

Раздаўся стук сярод ночы — і жывёлы прынялі Езуса і абагрэлі Яго ў той час, калі народ не прыняў свайго Валадара. Аднак, нягледзячы на ўсё, у цемру і холад гэтай ночы ўвайшло святло і цяпло Божай любові. Любоў абняла ўсю зямлю (2 Кар. 5, 14), а народ, які хадзіў у цемры, убачыў святло вялікае (Іс. 9, 2).

Усё гэта азначае, што Бог, які з вышыні нябёсаў спусціўся на нашу грэшную зямлю, у гэты цёмны і халодны свет, на самой справе схіліўся над намі. Ён нарадзіўся не ў каралеўскім палацы, але ў Батлеемскай стайні, бо павінен быў перамагчы злога духа сваёй пакорай. І кожны, хто знойдзе Яго ў гэтую знакавую ноч, таксама павінен схіліцца.

Гэтае схіленне Бога відаць нават у тапаграфіі месца, дзе Ён нарадзіўся. Гарады Святой зямлі пабудаваны на вяршынях гор. Гэта было зроблена для таго, каб выкарыстаць для сельскай гаспадаркі ўрадлівыя даліны і схілы гор. Таксама і Батлеем знаходзіцца на гары, у той час як багатыя пашы знаходзяцца ўнізе. Вуліцы Батлеема таксама вельмі пакручастыя і нават пабудаваны на розных узроўнях. Такім чынам, задняя частка многіх дамоў спускаецца крута ўніз, дзе калісьці знаходзіліся памяшканні для жывёлы.

Менавіта там Марыя з Юзафам у тую халодную і цёмную ноч, спяшаючыся, шукалі месца, дзе мог бы нарадзіцца Збаўца свету. Там Бог нахіліўся да зямлі, каб прыйсці ў гэты свет.

Тыя, хто шукае Бога, таксама павінны нахіліцца. Нават у наш час, каб увайсці ў грот Нараджэння ў Батлееме, найперш трэба моцна нахіліцца, прайсці праз нізкі праход і спусціцца глыбока ўніз. Там неабходна стаць на калені, каб дакрануцца да месца Нараджэння Езуса, дзе на лацінскай мове напісаны словы: «Hic Verbum Caro factum est» — «Тут Слова сталася Целам».

Такім чынам, Бог нахіляецца над намі, каб прыйсці да нас. І мы таксама павінны нахіліцца, каб знайсці Яго. Бог не мае ганарлівасці і прыходзіць, каб сваёю пакораю перамагчы яе. Гонар не можа перамагчы гонар. Толькі пакора можа яго перамагчы. Цемра таксама не можа перамагчы цемру. Яна можа быць пераможана толькі святлом. Гэта відавочна, і пра гэта мы ўсе вельмі добра ведаем.

Толькі самадастатковы, упэўнены ў сабе, упарты чалавек будзе працягваць жыць самазнішчальным жыццём, не гатовы прызнаць, што ён выбіўся з сіл і што яго жыццё зламалася. Але калі чалавек схіліцца перад Богам, то Ён падыме яго ўгору, адновіць і пераменіць.

«Чалавек, які ўяўляе сябе богам, у Хрысце сустракае сапраўднага Бога, які стаўся чалавекам. Непераўзыйдзеная ганарлівасць і гонар чалавека сустракаюць непераўзыйдзенае самапрыніжэнне і пакору Бога», — кажа сучасны англійскі антраполаг Крыстафер Уэст.

Менавіта таму Бог схіляецца над чалавекам, і мы сёння святкуем гэтую таямніцу Яго схілення над намі для таго, каб нас падняць і дапамагчы нам устаць. У гэтую святую ціхую ноч Божага Нараджэння Бог у вобразе Немаўляткі без шуму прыходзіць да нас, каб быць Богам з намі (Іс. 7, 14). Ён сёння зноў стукае ў дзверы нашых сэрцаў. Святое Пісанне кажа: «Вось стаю каля дзвярэй і стукаюся. Калі хто пачуе Мой голас і адчыніць дзверы, увайду да яго і буду вячэраць з ім, а ён са Мною» (Ап 3, 20).

У сувязі з гэтым паўстае пытанне: што сталася б, калі б Езус пастукаў у дзверы майго сэрца? Ці было б Яму месца ў ім? Марыя з Юзафам схаваліся ў Батлеемскай стайні, бо не было ім месца ў гасцініцы (Лк. 2, 7). А як адбываецца з намі?

У сучасным свеце існуе вялікая маральная праблема: ці мы маем месца ў нашых сэрцах для Божага права, для духу Евангелля, для бедных і цярпячых? Ці маем месца і час для Бога? Ці не праганяем Яго?

Праблема ў тым, што мы не маем часу для Бога. Праўда жыцця сучаснага чалавека вельмі суровая. Чым лепшыя сродкі камунікацыі, такія як мабільныя тэлефоны, інтэрнэт, самалёты, хуткія цягнікі і машыны, мы маем, тым менш часу застаецца ў нашым распараджэнні для Бога. Таму сучасны чалавек перажывае сапраўдны парадокс, у выніку якога для Езуса няма месца ў эканоміцы, палітыцы, заканадаўстве і нават рэлігійных практыках.

Таму ўзнікае пытанне: «Ці Бог ёсць у нашым сэрцы?». На жаль, у сучаснага чалавека праблема Бога не з'яўляецца найбольш неабходнай і тэрміновай, бо наш час і так ужо заняты і мы вельмі хутка знаходзім масу аргументаў, каб не слухаць Бога і не ўпусціць яго ў нашы сэрцы.

Сучасны свет жыве так, як быццам Бог і не існуе. Замест Божага закону ён прапануе абсалютную свабоду без адказнасці, замест працэсіі Божага Цела — парады сексуальнай роўнасці, замест урачыстасці Усіх Святых — Хэлоўін, замест віншаванняў на Божае Нараджэнне — сезонныя зычанні, так званыя «Season greetings» і гэтак далей.

Такім чынам, мы любім толькі сябе саміх і прагнем рэчаў, да якіх можам рэальна дакрануцца; прагнем шчасця, якое можам адчуць; прагнем поспеху ў спаўненні нашых планаў і мар. Мы цалкам запоўнены самімі сабою, так што ў нас няма месца для Бога. А таму няма месца і для іншых — для дзяцей, для бедных, хворых, цярпячых, маргіналаў, — як кажа Папа Бэнэдыкт XVI. У свеце няма міру і справядлівасці, сям'я перажывае крызіс, дэвальвуецца Божы дар жыцця, абагаўляецца амаральнае жыццё, распаўсюджваюцца наркаманія і СНІД, якія сталі пандэміяй сучаснага свету, і гэтак далей.

Усё гэта вядзе да наступнай высновы: калі завершыцца гісторыя чалавецтва і ўсе яе кнігі будуць напісаны, адным з найбольш сумных сказаў можа стаць такі: «Богу не было месца ў гасцініцы нашых сэрцаў».

Не было месца! Як дзіўна і крыўдна за гэты свет, бо ў ім няма месца Богу, які сваім вучэннем і патрабаваннямі проста не ўпісваецца ў яго, не ўпісваецца ў парадак нашага дня, графік нашых заняткаў і прыярытэтаў.

Зноў згадваюцца словы Евангелля пра тое, што Бог прыйшоў да сваіх, і свае Яго не прынялі (Ян 1, 10-11). Пры гэтым мы забываемся, што тыя, якія Яго прымаюць, становяцца дзецьмі Божымі (Ян 1, 12).

Самае вялікае няшчасце, калі чалавек размінаецца з прыходзячым Богам.

А як ёсць з намі? Ці ў нашых сэрцах ёсць месца для Бога? Бо калі сапраўды ёсць, то Езус адорыць нас шматлікімі дарамі. Ноч Божага Нараджэння — гэта ноч Божых дароў. Прыслухаемся: Езус стукае ў дзверы нашых сэрцаў. Ці мы чуем Яго стук? Ці спяшаемся адчыніць Яму, каб Ён увайшоў туды і адарыў нас сваімі дарамі?

Літургія сённяшняга свята заклікае нас паспяшаць у Батлеем, паспяшыць туды найперш у духоўным сэнсе. Гэта азначае — адважыцца выйсці з нашых грэшных звычак і задавальненняў, каб звярнуцца да Бога, які прыйшоў да нас. Гэта таксама азначае выйсці за нашыя асабістыя абмежаванні і абмежаванні сучаснага свету і нарэшце спаткацца з Богам.

Таму нам не дазволена заставацца пасіўнымі і толькі чакаць. Нам неабходна знайсці месца Богу ў сваім сэрцы і сваёй душы! Ён схіляецца над грэшным чалавекам, стукае ў яго сэрца і просіцца, каб мы Яго ўпусцілі. Нездарма святы айцец Францішак у апостальскай адгартацыі «Evangelii gaudium» — «Радасць Евангелля» — кажа, што Бог ніколі не стамляецца, прабачаючы нам.

Таму, чалавек, зрабі месца для Езуса, зрабі як мага больш месца для Яго ў гасцініцы свайго сэрца, і сапраўды станеш дзіцём Божым. Езус сваёй ласкай пераменіць цябе, каб ты быў тым, які створаны па вобразе і падабенстве Божым.

Езус стукае ў дзверы твайго сэрца! Ці ты, чалавек, чуеш і ці адчыняеш іх Яму?

Сучасны свет кожны дзень прыносіць нам усё новыя і новыя сюрпрызы. Але найбольшым сюрпрызам ёсць тое, што Бог, як кажа Папа Францішак, кожны дзень нас здзіўляе, парушаючы схемы нашага жыцця і нашы планы, і кажа: паверце Мне, не бойцеся і ідзіце за Мной! Ці мы сапраўды дазваляем Яму ўвайсці ў наша жыццё?

Езус нарадзіўся два тысячагоддзі таму. Але праз паслугу Касцёла Ён праз сваю ласку нараджаецца і сёння, у XXI стагоддзі, голасам Касцёла стукае ў нашы сэрцы. Ці гэта нас не здзіўляе? Ці мы дазваляем Яму ўвайсці ў наша жыццё? Ці хочам, каб Ён яго перамяніў? Каму мы больш давяраем? Яму ці абяцанням гэтага свету, у якім няма трываласці і які страсаюць розныя крызісы?

Езус стукае ў нашы сэрцы і хоча, каб мы пачулі Ягоны стук і знайшлі Яму месца, бо толькі ў Ім чалавек будзе шчаслівым і будзе будаваць шчасце ўсяго грамадства.

Дарагія браты і сёстры!

Сёння мы радаснымі вуснамі ўсклікаем: «Хвала на вышынях Богу, а на зямлі супакой людзям добрай волі!» Няхай наша Бацькаўшчына — Беларусь — стане краінай сапраўднага праслаўлення Бога праз захоўванне Яго закону і жыцця згодна з маральнымі нормамі! Няхай у ёй запануе Божы спакой, узаемная згода і паразуменне, падмуркам якіх ёсць спакой у душы кожнага чалавека!

Ад усяго сэрца віншую ўсіх вас са святам Божага Нараджэння. Віншую каталікоў і тых хрысціян, якія разам з намі сёння яго адзначаюць. Віншую праваслаўных братоў і сясцёр і зычу ім падтрымліваць дарогу прыходзячаму Збаўцы. Віншую ўсіх людзей добрай волі. Няхай прыклад Бога, які схіліўся над грэшным чалавецтвам і стукае ў нашы сэрцы, дапаможа нам у духу пакоры перамагчы нашу пыху і падзелы нашага грамадства, каб мы ўсе ў Езусе Хрысце былі адзінымі.

Радасных, шчаслівых, поўных Божай ласкі і прысутнасці Хрыста ў нашых сэрцах святаў і шчаслівага надыходзячага Новага года.

Хрыстус нарадзіўся — Бог аб'явіўся! Ён стукае ў нашы сэрцы! Іх неабходна адкрыць!

З гэтымі пажаданнямі ў знак нашай духоўнай еднасці дзялюся з усімі вамі аплаткай, даручаю вас апецы Багародзіцы Марыі і ад усяго сэрца блаславяю ў імя Айца і Сына, і Святога Духа. Амэн.

# ТЭЛЕВІЗАРЫ ДЛЯ ВЫХАВАНЦАЎ ЖОДЗІНСКАГА ДЗІЦЯЧАГА ДОМА

**Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандр Якабсон ад імя работнікаў кантрольнага ведамства павіншаваў выхаванцаў Жодзінскага дзіцячага дома.**

Да рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці» далучыліся і работнікі Камітэта дзяржкантролю. Сёлета яны завіталі ў Жодзінскі дзіцячы дом. Сёння там жывуць больш за 70 дзяцей ва ўзросце ад трох да сямі гадоў. Падарункі дзецям перадаў сам Аляксандр Якабсон. Акрамя набораў цукерак, Камітэт дзяржкантролю падарыў дзіцячаму дому два шырокаэкранныя вадкакрышталічныя тэлевізары, якія за асабістыя сродкі набылі работнікі ведамства. У адказ дзеці падрыхтавалі для гасцей навагодні спектакль. Дарэчы, Камітэт дзяржаўнага кантролю актыўна ўдзельнічае ў акцыі «Нашы дзеці» не першы год. Шматлікія падарункі ад дзяржаўных кантралёраў ужо атрымлівалі выхаванцы Івянецкага дома-інтэрната, Старадарожскага дзіцячага дома, сталічнага дзіцячага дома № 5.



**Надзея ПАЎЛАВА.**

■ Зялёны кірмаш

# З ЛЕСУ, У КАДЦЫ ЦІ БУКЕТ?

**Сёлета лясгасы краіны плануюць прадаць каля 180 тысяч навагодніх елак. Для продажу падрыхтаваны і елкі ў кадках, каля тысячы штук. Ні табе іглiцы на падлозе, ні неабходнасці выкідваць дрэва праз некалькі тыдняў. Але, як кажуць прадстаўнікі Міністэрства лясной гаспадаркі, вышэйзгаданыя дрэвы прадаюцца не так актыўна, як звыклыя ссечаныя.**

— Тут, відаць, справа не толькі ў кошце (дрэва ў кадцы, зразумела, абыходзіцца даражэй). Многія людзі проста не ведаюць, што з такой елкай рабіць пасля свят, — лічыць начальнік упраўлення лясной гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі Валянцін Шатраўка. — Калі ёсць магчымасць высадзіць дрэва ў грунт ці пакінуць у кадцы, знайшоўшы для яе месца на прысядзібным участку, гэта вельмі добра. Але для жыхароў гарадскіх кватэр такі варыянт не заўжды падыходзіць.

Сёлета будуць працаваць больш за тысячу елачных кірмашоў, 30 з якіх — у сталіцы, а астатнія — у абласных і раённых гарадах. Трэба сказаць, што летась гэтая колькасць была значна меншай. Святочнымі дрэвамі ад лясгасаў у Беларусі тады гандлявалі на 600 кірмашах.

Пакупнікам, дарэчы, будуць прапаноўваць не толькі елкі, але і сосны, і розныя варыянты аздобленых навагодніх букетаў. І калі кошт елкі на гарадскіх кірмашах пачынаецца ад 35 тысяч (у Мінску і абласных гарадах можа быць крыху даражэй), то букеты каштуюць ад 25 тысяч і вышэй, у залежнасці ад афармлення.

Нарыхтоўка елак для кірмашоў часцей за ўсё адбываецца на спецыяльных плантацыях, таксама на продаж ідуць дрэвы, што высякаюцца, напрыклад, падчас расчысткі прасек.

Каб не дапусціць несанкцыянаванай вырубкі елак, з 20 снежня ўзмоцнена ахова ўгоддзяў. Асабліва пільна супрацоўнікі лясгасаў збіраюцца назіраць за тымі, што прылягаюць да аўтамабільных дарог, а таксама за найбольш каштоўнымі ляснымі масівамі. За незаконную высечку аднаго дрэва прадугледжаны штраф, які складае да 30 базавых велічынь, калі размова ідзе пра звычайны лес, і да 50, гэта масіў, які асабліва ахоўваецца.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ** ■

# ІКОНА ПРАСВЯТОЙ БАГАРОДЗІЦЫ «МІНСКАЯ» Ў ЗОЛАЦЕ І СЕРАБРЫ

**Нацыянальны банк Беларусі выпусціў у абарачэнне памятныя манеты «Ікона Прасвятой Багародзіцы «Мінская» серыі «Праваслаўныя цудатворныя іконы».**

У золаце такая манета — наміналам 1000 рублёў, пробай сплаву 999, масай 100 г — выпушчана тыражом да 200 штук. Меншая па памерах залатая манета наміналам 50 рублёў, пробай сплаву 999 і масай 5 г мае тыраж да 4000 штук. Спажыўцам прапануецца і сярэбраная манета гэтай серыі — наміналам 500 рублёў, пробай сплаву 925, масай 500 г і тыражом да 500 штук.

У цэнтры аверса — арнамент у выглядзе вінаградных лазы, якая сімвалізуе Багародзіцу, усярэдзіне якога знаходзіцца памятны крыж, усталяваны на замчышчы ў г. Заслаўі ў сувязі са святкаваннем 1000-годдзя Праваслаўнай царквы на Беларусі. У цэнтры рэверса — абраз Прасвятой Багародзіцы «Мінская»; на сярэбранай манеце наміналам 500 рублёў — выявы німбаў Багародзіцы і Ісуса Хрыста, зоркі на вопратцы Багародзіцы і арнамент выкананы золатам. Манеты адчаканены на манетным двары ў Германіі якасцю «пруф».

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Добрая навіна

# ДЭМАГРАФІЧНЫ ПРАГРЭС

**На Брэстчыне сёлета, упершыню за апошнія дзесяцігоддзе, дасягнуты станоўчы дэмаграфічны баланс.**

— Натуральны прырост насельніцтва за 10 месяцаў складае 207 чалавек, — сказаў на прэс-канферэнцыі для журналістаў рэгіянальных і цэнтральных СМІ ў сераду ў Пружанах **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР.**

Кіраўнік вобласці адзначыў, што названая лічба стала вынікам работы па прыгаду дзесяці гадоў. Свой уплыў на дэмаграфічную сітуацыю зрабілі мадэрнізацыя ўстаноў аховы здароўя, будаўніцтва жылля, дзіцячых садкоў і школ. Сёння можна гаварыць аб тым, што Брэстчына з'яўляецца адным з лідараў па нараджальнасці ў рэспубліцы. У гэтым годзе паказчык нараджальнасці на 1000 чалавек насельніцтва ў вобласці склаў 13,1 дзіцяці.

**Яна СВЕТАВА** ■

# «ЗВЯЗДА» БЫЛА І ЗАСТАЕЦЦА ДЛЯ МЯНЕ ПАТРЭБНАЙ!

**Так сказала наша падпісчыца Валянціна Лішко, прымаючы ад аднавяскоўцаў віншаванні з выйгрышам у рэкламнай гульні. Падпісная квітанцыя прынесла ёй прыемны сюрпрыз — тэлевізар LG (дыяганаль экрана — 60 сантыметраў). Яго ў мінулую пятніцу мы даставілі ў аграгарадок Дубна. Урачыстае ўручэнне адбылося ў будынку мясцовай школы, дзе шмат гадоў працавала ўладальніца прыза.**






— Газету «Звязда» я выпісваю трыццаць гадоў, заўжды знаходзіла і знаходжу ў ёй цікавую інфармацыю, — сказала Валянціна Станіславаўна. Справа ў тым, што ўладальніца звяздоўскага прыза да выхаду на пенсію выкладала беларускую мову і літаратуру. Зразумела, газета была для настаўніцы добрай дарадцай у выхаваўчай рабоце, першай знаёміла з навінкамі беларускага прыгожага пісьменства. На працягу многіх гадоў Валянціна Ляшко з'яўляецца дэпутатам Дубненскага сельсавета — і ў гэтай адказнай справе ёй дапамагае газета «Звязда», даносіць карысныя веды ў выпусках «Мясцовага самакіравання».

Пра такіх, як Валянціна Станіславаўна, кажуць: чалавек з актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Аднавяскоўцы прывыклі бачыць яе ў цэнтры грамадскіх спраў. Суседзі сталага веку памятаюць яе ў камсамольскім узросце, няўрымслівую, нярэдка за рулём матацыкла. Валянціна Лішко і сёння сябруе з тэхнікай — па-майстэрску кіруе сваім легкавіком. А што датычыцца хатняй гаспадаркі, то ў гэтым, па яе словах, вопыт таксама набіраўся не без уплыву звяздоўскай «Хатняй энцыклапедыі» і падборак кулінарных рэцэптаў.

Сапраўды, для такіх людзей, як Валянціна Станіславаўна, газета «Звязда» была і застаецца патрэбнай. Не перабольшу, калі скажу, што і газеце патрэбны такія чытачы.

Відаць, таму шчаслівы выпадак справядліва прынёс ёй прыз у рэкламнай гульні. З чым «звяздоўцы» і віншуюць сваю падпісчыцу!

***Гэтыя фотаздымкі зроблены, калі мы ў прысутнасці настаўнікаў Дубненскай сярэдняй школы ўручалі тэлевізар паважанай Валянціне Станіславаўне Лішко.***

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

*Мастоўскі раён.*

## ПА ЯКІМ ГРАФІКУ Ў ПРЫГАРАД?

Паводле інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства "Мінсктранс", 24, 31 снежня, 4 і 11 студзеня прыгарадныя аўтобусы будуць перавозіць пасажыраў па графіку пятніцы. 6 студзеня — як па суботніх днях. 25 снежня, а таксама 1-2 і 7 студзеня — па графіку нядзельных дзён. Акрамя таго, 31 снежня і 1 студзеня будзе адменена выкананне рэйсаў па асобных прыгарадных маршрутах. Сачыце перад паездкай за змяненнямі ў раскладзе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


Лічу за вялікі гонар павіншаваць праз газету «Звязда» нашых **хлебаробаў, шматдзетных маці і ветэранаў** з Новым годам. Сонечнага шчасця вам, здароўя і даўгалецця!



**З павагай, Сяргей Мікалаевіч ПРЫЛУЦКІ, старшыня праўлення СВК "Палессе АВМ".**

*УНП 200114884*



**З "Агра-Пелішча" — для беларускага касманаўта!**

Гэта ж цудоўна! Сёння ў нашага дарагога **Пятра КЛІМУКА** ўрачыстае свята! Непрыкметна мінула 40 гадоў, калі ён у першы раз паляцеў у космас. Хто з беларусаў змог рушыць услед? Толькі Уладзімір Кавалёнак і Алег Навіцкі. Жыхары вёскі Пелішча і ўсяго Камянецкага раёна жадаюць Вам моцнага здароўя, шчырай усмешкі, а разам з ёй — шчодрага даўгалецця.

**З павагай, Мікалай Барысавіч БРЫНЧУК, старшыня праўлення ААТ «Агра-Пелішча» Камянецкага раёна.**

*УНП 200193257*

***БЕЗ НАШЫХ ДАРОГ НЕ БЛІЗКІ І РОДНЫ ПАРОГ***



**Шаноўны Пётр Ільіч!**

Сёння ў Вас, першага беларускага касманаўта, цудоўнае свята — саракагоддзе з дня першага палёту ў космас. Клімук, як і Гагарын, — гэта ж цудоўна!

Мы будуем дарогі па ўсёй Брэсцкай вобласці. Вы ж выбралі адну — у космас. Няхай гэтыя дарогі вядуць нашу Беларусь да жаданай мэты — міру і дабрабыту на Зямлі.

**З павагай, Пётр Андрэевіч СКАРАБАГАЦЬКА, генеральны дырэктар унітарнага прадпрыемства "Брэстаблдарбуд".**

*УНП 200020752.*



**6 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2014 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ____________________

(аддзяленне сувязі)

____________________ **на I кв. або 1–е паўг. 2014 года**

**Хатні адрас і тэлефон** ________ ____________________

(індэкс)

____________________

____________________

**Удачы ў розыгрышы!**

**КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»**

**на I квартал або 1-е паўгоддзе 2014 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе <u>ДА 11 СТУДЗЕНЯ</u> ў рэдакцыю на адрас: <u>220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.</u>**







Сярод падпісчыкаў 14.01.2014 г. будуць разыграны 7 мультыварак Scarlet і суперпрыз – тэлевізар Samsung. Вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» да 24.01.2014 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31.03.2014 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2014 года і пашпарта. Пасля 31 сакавіка выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Тэлефон для даведак (017) 287 18 38.**

**Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 14.11.13 г.**

**<u>ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 15.11.13 ПА 31.03.14.</u>**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2255 ад 30.10.13, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.


■ Інфарм-укол

# ТВАРАЖОК СА СМЯТАНКАЙ

**Многія лічаць: чым больш тлустае малако, тым лепш. Аднак малочны тлушч змяшчае халестэрын, які спрыяе развіццю атэрасклерозу і сардэчна-сасудзістых захворванняў. Вучоныя рэкамендуюць ужываць малако і малочныя прадукты з нізкай колькасцю тлушчу (0,5-1,5%). Абястлушчаныя малочныя прадукты з лячэбнай мэтай прымяняліся яшчэ ў старажытныя часы. Сыроватка, пахта, сыракваша шырока прымяняліся ў якасці разгрузачнай дыеты пры атлусценні, хваробах страўнікава-кішачнага тракту, гіпертаніі, атэрасклерозе, хваробах печані і падстраўнікавай залозы.**

**МАЛАКО**. Яго найбольш каштоўныя кампаненты: бялок, лактоза (малочны цукар), вітаміны (асабліва тлушчараставальныя), мінеральныя рэчывы. У вялікай колькасці змяшчаецца кальцый, неабходны для росту, нармальнай працы сэрца, нервовай і мышачнай сістэм. Недахват кальцыю прыводзіць да развіцця рахіту ў малых дзяцей, узнікненню астэапарозу, пераломаў касцей у дарослых, затрымкі росту, парушэнню фарміравання касцей і зубоў, карыесу, кроватачывасці сасудаў, павышанай нервовай узбуджальнасці (пры цяжкіх формах дэфіцыту — сутаргаў), парушэнню работы сардэчнай мышцы, павышэнню артэрыяльнага ціску.

Паводле слоў **валеолага 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алены ГАРНІЦКАЙ,** сутачная патрэба ў кальцыі для дзяцей складае: 4-6 гадоў — 800 мг, 7-10 гадоў — 1000 мг, 14-17 гадоў — 1200-1400 мг. Такім чынам, неабходна штодня выпіваць 400-600 мл малака або кісламалочных прадуктаў, з'ядаць 50-100 г тварагу і 5-10 г сыру.

Фактычна ў кожнага другога чалавека ў кішэчніку не хапае ферменту, які расшчапляе малочны цукар (лактозу). Гэтыя людзі вымушаны адмаўляцца ад натуральнага малака, але яны могуць ужываць кісламалочныя прадукты.

Кісламалочныя прадукты лепш засвойваюцца, павышаюць устойлівасць да інфекцый, аказваюць супрацьалергеннае дзеянне, падтрымліваюць нармальную мікрафлору кішэчніка, змяшчаюць вялікую колькасць кальцыю, фосфару, магнію, цынку і інш, вітаміны $B_1$, $B_2$, $B_6$, $B_{12}$, вітамін А.

**КЕФІР**. Гэта прадукт змешанага, малочнакіслага і спіртавога браджэння. Яго робяць з дапамогай закваскі, прыгатаванай на кефірных грыбках. Кефір рэкамендуецца ўжываць пры калітах, гастрыце, хваробах печані, нырак, лёгкіх, бранхіце, анеміі, атэрасклерозе, інфаркце міякарда, гіпертаніі. Японскія вучоныя выявілі, што кефір здольны стрымліваць распаўсюджванне ракавых клетак і актывізаваць імунную сістэму. Прадукт раяць ужываць усім, хто пакутуе ад хранічных інфекцый — напрыклад, герпесу. Кефір дапамагае пры сіндроме хранічнай стомленасці, парушэннях сну і неўрозе.

**<u>ВЫБІРАЙЦЕ ПРАВІЛЬНА</u>**

❍ Глядзіце на ўпакоўку: яна не павінна быць успушанай. Тэрмін захоўвання сапраўды карыснага малака і малочных прадуктаў — ад 3 да 7 сутак.

❍ Усе малочныя прадукты павінны быць аднароднай кансістэнцыі, без буйных крупак (акрамя тварагу). Хоць моцная крупінчатасць у тварагу — таксама не лепшы паказчык.

❍ Не павінна быць ніякіх староннніх пахаў. Кефір павінен пахнуць кефірам, а смятана — смятанай.

❍ У прадукце не павінна быць пузыроў і поласцяў. Калі аддзяляецца сыроватка, значыць, прадукт не першай свежасці.

❍ Кісламалочныя прадукты не павінны быць надта кіслымі (за выключэннем ацыдафільных прадуктаў, якія першапачаткова маюць павышаную кіслотнасць).

❍ Натуральныя малочныя і кісламалочныя прадукты не павінны змяшчаць крухмал, араматызатары, фарбавальнікі, стабілізатары, падсалоджвальнікі і кансерванты.

**СЫР**. Адзін з самых лепшых, карысных прадуктаў. Падчас выспявання сыру яго бялок становіцца растваральным і амаль поўнасцю (на 98,5 працэнта) засвойваецца арганізмам. Сыр — гэта шмат бялку, тлушчу, соляў кальцыю і фосфару. Працёрты сыр лепш засвойваецца. Нават пры добрым перажоўванні шчыльныя кавалачкі цвёрдых сыроў доўга затрымліваюцца ў страўніку, а таму не варта ўжываць іх на вячэру.

**ТВАРОГ**. Вельмі каштоўны малочнакіслы прадукт, выраблены шляхам сквашвання малака малочнакіслымі бактэрыямі і выдалення сыроваткі. Дзякуючы сваім унікальным спажыўным вартасцям тварог застаецца незаменным прадуктам для дзіцячага і дыетычнага харчавання. Яго ўжываюць пры хваробах печані, атэрасклерозе, гіпертаніі, гастрыце, язвавай хваробе страўніка і 12-перснай кішкі,



паталогіі жоўцевага пузыра, падстраўнікавай залозы і хваробах кішэчніка. Наогул тварог называюць прадуктам, які «не мае забароны».

**ЁГУРТ**. Паляпшае працэс стрававання, падтрымлівае баланс кішэчнай мікрафлоры. Жывыя культуры ёгуртаў дапамагаюць пераатраўліваць малочны вуглявод лактозу, таму ёгурт лёгка засвойваецца нават тымі, у каго назіраецца непераноснасць лактозы. Ёгурт, як і іншыя малочныя прадукты, змяшчае вітаміны, асабліва $B_2$ і $B_{12}$, кальцый і іншыя мінеральныя рэчывы.

Многія прадукты, якія мы прывыклі называць ёгуртамі, у працэсе вытворчасці падвяргаюцца пасля сквашвання тэрмічнай апрацоўцы. Гэта падаўжае тэрмін захоўвання, але забівае жывыя культуры, якія якраз і аказваюць станоўчы ўплыў на наш арганізм. Такія прадукты маюць назву «ёгуртны прадукт», а не «ёгурт». Усе жывыя ёгурты захоўваюцца ў халадзільніку пры тэмпературы +2 — +6 градусаў.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
24 СНЕЖНЯ 2013 г.
АЎТОРАК
№ 26 (15735)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года



Імёны

## Арцём Міхаленка:

# «Я ПА НАТУРЫ БАЕЦ, ТАМУ ЗАЎСЁДЫ ІМКНУСЯ ДАБІЦЦА СВАЙГО»

**Сваю музыкальнасць спявак Арцём Міхаленка называе дарам лёсу, а публічнасць успрымае як бонус да магчымасці дарыць людзям пазітыў. За плячыма Арцёма — удзел у «Еўрабачанні-2010» у складзе гурта «3+2». Але ён зноў замахнуўся на «Еўрабачанне». Яго дэвіз: «Нясумна, стыльна, іскрамётна».**

**— Арцём, раскажыце пра месца, дзе нарадзіліся і зрабілі першыя крокі ў музыцы?**

— Я з'явіўся на свет у беларускай глыбінцы, як я лічу, у культурным «сэрцы» нашай краіны — пасёлку Алекшыцы недалёка ад Гродна. Рос у музычнай сям'і, таму з маленства мне прывівалі любоў да музыкі і я вучыўся іграць на розных інструментах. У маім доме заўсёды можна было знайсці ўсё: ад ударнай устаноўкі да скрыпкі, баяна, акардэона, гармоніка. У музычнай школе займаўся па класе скрыпкі і фартэпіяна, потым паступіў у Гродзенскі музычны каледж мастацтваў. Менавіта там я набыў першы досвед зносін з публікай.

**— Потым трапілі ў Прэзідэнцкі аркестр. Ці складана было вытрымаць выпрабаванне на прафесіяналізм?**

— Пасля адбору мне пашчасціла працаваць з выдатнымі музыкантамі. Прыемна прыйсці ў прафесійны калектыў, дзе людзі падтрымліваюць цябе парадамі і ставяцца з разуменнем. Гэта быў вельмі каштоўны вопыт, які дазволіў рухацца наперад. І я ганаруся тым, што змог папрацаваць з многімі знакавымі артыстамі. Мы і сёння супрацоўнічаем і падтрымліваем сувязь з калектывам. Магчыма, аркестр з'явіцца ў маім нумары на фінальным адборы «Еўрабачання»…

**Я стараюся знаходзіць час для ўсяго. Для сям'і — у першую чаргу. Ёсць дзень, на які я планую свае працоўныя сустрэчы, здымкі. А на наступны дзень застаюся дома.**

**— Калі згадваць «Еўрабачанне-2010» — што даў вам конкурс?**

— Тое быў мой першы досвед выступлення на сусветнай сцэне. Я меў магчымасцьназіраць, як працуюць прафесіяналы ў розных сферах і на розных этапах падрыхтоўкі да конкурсу. З той сітуацыі я пастараўся атрымаць максімум карысці, каб не паўтараць мінулых памылак. Узяў усё, што мог на той час. «Еўрабачанне» — унікальны песенны форум Еўропы. Яго глядзіць вялікая колькасць людзей. І для выканаўцы гэта цудоўная магчымасць данесці сваё бачанне музыкі і «прагучаць» са сваёй кампазіцыяй. Безумоўна, калі нехта лічыць, што пасля конкурсу ён стане «зоркай» і яму гарантавана ўсеагульная любоў аўдыторыі, то можна наогул сыходзіць з прафесіі. Я ўспрымаю «Еўрабачанне» проста як этап майго творчага існавання на сцэне. Нават трапіць у лік фіналістаў нацыянальнага адбору — многае значыць. Калі ж мне выпадзе магчымасць прадстаўляць нашу краіну на еўрапейскай сцэне, то я змагу пра многае сказаць сваёй песняй.

**(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)**

Любімы рэцэпт

# ХЛЕБНАЙ ДЗЕІ ЧАРАЎНІК

**Назваць Канстанціна Ларкова проста пекарам язык не паварочваецца. Ён — сапраўдны творца, мастак ад хлебапякарства. Дзівосы, што майстар вырабляе з цеста, — найтанчэйшая ювелірная работа, якая, здаецца, пад сілу толькі самаму таленавітаму скульптару. Пэўна, Кастусь ведае пра хлеб усё: ад сучасных хітрасцяў у рэцэптуры да хлебных традыцый нашых продкаў. А ўвесь сакрэт у тым, што для маладога чалавека выпяканне — не толькі прафесія, але і любімая справа жыцця.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Майстэрства скараецца цікаўным

На першы погляд вобраз Кастуся (менавіта так прадстаўляецца пекар, і, падаецца, гэтая форма імя пасуе яго вобразу больш, чым сур'ёзна-засяроджанае «Канстанцін») не надта атаясамліваецца з прафесіяй пекара. Высокі і хударлявы — не скажаш, што гэты чалавек прысвячае жыццё «хлебабулачнай справе». Але добразычлівасць і ўсмешка, якая амаль не сыходзіць з яго вуснаў на працягу ўсёй нашай размовы, пацвярджаюць словы майго суразмоўцы, што пекары — людзі добрыя. Невядома, якую ролю адыгралі рысы характару на шляху да хлебапякарнага цэха, але сам Кастусь Ларкоў кажа, што, хутчэй, прафесія выбрала яго, чым ён — прафесію (якой служыць ужо амаль 15 гадоў).

— У дзяцінстве кім толькі ні хацеў стаць,— усміхаецца Кастусь.— Але думкі быць пекарам не было.

Скончыўшы кулінарнае вучылішча ў Віцебску і Магілёўскі універсітэт харчавання, хлопец пачаў працаваць на хлебазаводзе ў Верхнядзвінску. Пакрысе стала прыходзіць захапленне ад працы і жаданне ў ёй удасканальвацца.

— Калі нечым займаешся, міжволі ўзнікае пытанне: «А ці ўсё правільна я раблю?» І пачынаеш цікавіцца не толькі працэсам выпякання, але і традыцыямі, звязанымі з ім.

Кастусь кажа, што яго вучылі тэхналогіям выпечкі хлеба, а не ўпрыгожванню. Таму ўсё аздабленне для сваіх вырабаў ён прыдумляе сам. Ды яшчэ сцвярджае, што ствараць такія шэдэўры мастацтва — зусім не складана.

— Я працую майстрам, а ўпрыгажэннямі займаюся ў вольную ад працы хвілінку. Калі паступае замова з крамы на пэўную колькасць пірагоў і караваяў, у маёй брыгадзе ведаюць, што яе выканаю я, хоць у мае абавязкі гэта не ўваходзіць.

Праўда, часам і ў такога спецыяліста ўпрыгожванне каравая можа заняць не адну гадзіну. Усё залежыць ад складанасці вырабу. Але гэта не прыносіць стомы.

— Калі справа, якую ты робіш, задавальняе і радуе душу, тады і праца — не праца. У мяне часам пытаюць, ці падабаецца мне мая работа, на што я адказваю: не. А прафесія — вядома! Бо мая непасрэдная праца — гэта вытворчасць, але прафесія пекара гэтым не абмяжоўваецца і дае шырокае поле для творчасці.

**(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)**

Духоўны выбар

# «КСЯНДЗОМ МОЖА СТАЦЬ ТОЛЬКІ САПРАЎДЫ ДОБРЫ ЧАЛАВЕК»

**Яшчэ ў школе ён вырашыў стаць ксяндзом і пасля яе заканчэння паступіў у Пінскую духоўную семінарыю, а цяпер піша навуковую працу пра эўтаназію і ў вольны час любіць пагуляць у футбол. Карэспандэнт «Чырвонкі» сустрэўся з клерыкам Раманам СТРАШКО і даведаўся, ці можна на іспытах у семінарыі спісаць са шпаргалкі, як адбываецца семінарская практыка і якія абяцанні складаюць клерыкі перад святарскімі пасвячэннямі.**

З клерыкам Раманам, які праходзіць практыку пры Архікафедральным касцёле ў гонар Найсвяцейшай Дзевы Марыі, мы сустракаемся з самага ранку ў касцёльнай канцылярыі. Праз гадзіну яму прынясуць вялікі стос пошты, спіс імёнаў людзей, за якіх трэба будзе памаліцца на вячэрняй імшы, але пакуль ён мае крыху часу і распавядае нам пра свой жыццёвы выбар.

**(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)**


Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
24 12 2013 г.

*Дзённік першакурсніцы*

# ЗНАЙСЦІ СЯБЕ НАНОЎ...

**Ад рэдакцыі**

*Па прапанове «Чырвонкі» аўтарка, студэнтка першага курса Інстытута журналістыкі, з першых дзён сваёй вучобы ўзялася весці дзённік. Уражанні ад вялікага горада, новых сяброў-аднакурснікаў, дысцыплін, інтэрнацкага побыту... У першай частцы, надрукаванай у нумары «ЧЗ» ад 13 лістапада, Кацярына з захапленнем распавяла пра пачатак навучання і велізарнае жаданне вучыцца, цудоўныя стасункі з суседкамі па пакоі, «вясёлы» халадзільнік, зусім не па-студэнцку забіты рознымі прысмакамі ды ласункамі... Падзялілася, што запісалася на трэніроўкі, ходзіць на танцы. Праўда, ужо менш чым праз два месяцы вучобы ў нататках дзяўчыны ўсё часцей пачалі сустракацца словы «сон» і «стомленасць»... Вучоба становіцца ўсё больш напружанай, бо наперадзе, не паспееш азірнуцца, — першая сесія... А ці тое яшчэ будзе! Чакаем працягу...*

***27/10/2013***

…Вось і надышоў той момант, калі цярпенне скончылася ва ўсіх. Такіх размоў яшчэ ніколі не было ў нашым пакоі!.. Не вельмі люблю высвятленні адносін, таму «змылася» ў чытальную залу, каб падрыхтавацца да філасофіі і беларускай мовы.



Эканоміка — ну, вельмі зразумелая дысцыпліна...

***28/10/2013***

Няўжо пачалося засяленне ў новы інтэрнат? Выдатна! Але я не адпрацавала некалькі абавязковых гадзін на карысць інтэрната… Выпраўляюся мыць-уцяпляць вокны. Прапускаю трэніроўку. Дапісваю маленькую заметку на сайт студгарадка БДУ. Спадзяюся, што апублікуюць. Перад сном чытаю падручнікі. Заўтра ўсё атрымаецца!

***29/10/2013***

Які доўгі дзень… Заняткі, потым генеральная рэпетыцыя да Дня першакурсніка. Нават на яе мая група прыйшла не ў поўным складзе. Усё б нічога, але галоўнага героя трэба падмяняць. Адразу пасля выступлення групы (добра, што мы ў пачатку па сцэнарыі) накіроўваюся ў інтэрнат, каб забраць рэчы з пакоя і выселіцца з яго. Бацькі прыехалі на дапамогу, вельмі рада гэтаму. Пакуль выселілася, ногі забалелі бегаць. Адразу ж накіроўваемся на машыне да новага інтэрната, які знаходзіцца на вуліцы Чурлёніса (на старой карце не знайшлі месца размяшчэння, дапамог інтэрнэт). Гадзіны праз тры я — ужо бліжэй да фінішу. І пачалося. Запаўненне дагавора ў адным пакоі, запіс і афармленне — у другім, пашпартыст — у трэцім, загадчык — у чацвёртым, камендант — у пятым. Касцялянша двума паверхамі ніжэй… Першае ўражанне ад пакоя неадназначнае. Месца шмат, свая кухня, ванны пакой і прыбіральня. Шмат будаўнічага смецця… Як толькі занеслі ўсе мае рэчы, выправіліся ў краму. Прыборку ў пакоі пачала каля 22 гадзін. Пакуль не прывяла ў парадак, не ачысціла ўсё ад тоўстага слоя белага пылу і не вымыла падлогу, спаць не пайшла. Люблю чысціню і парадак. Толькі а трэцяй гадзіне ночы накіравалася ў душ…

***30/10/2013***

Ну вось! Праспала на заняткі. Стамілася. Арганізм не паспеў адпачыць за 3,5 гадзіны. Я нават не чула будзільніка. Напэўна, гэта да лепшага. Сёння ж доўгачаканы Дзень першакурсніка, пасля якога плануецца святкаванне…

***4/11/2013***

Кожны дзень пасля пар, калі вяртаюся ў інтэрнат, адчыняю дзверы з надзеяй — у мяне будзе суседка! Але ідэя рассыпаецца на маленькія друзачкі. І сёння няма… Адзінота пачынае надакучваць. Калі маю патрэбу ў размове — іду да суседак па блоку ці проста ўяўляю, быццам жыву не адна.

Праводжу шмат часу за ноўтбукам і канспектамі. Па старой звычцы з каледжа іду напралом. Спрабую выканаць усё і толькі якасна.

***6/11/2013***

З раніцы абварыла руку… супам. Толькі я так магла.

Англійская мова застаецца для мяне адной з цяжкіх дысцыплін. Спрабую размаўляць, але не хапае слоўнікавага запасу. І вельмі дрэнна тое, што не так шмат часу аддаю на падрыхтоўку. Такімі тэмпамі я далёка не прасунуся.

***13/11/2013***

Англійская мова. Прыходжу на заняткі, а выкладчыка нашага сёння няма. Затое на першай пары паглядзелі фільм на мове арыгінала. За праглядам злавіла сябе на думцы, колькі ж слоў я не ведаю…

Набываю «Звязду»: ужо ўвайшло ў звычку купляць час ад часу перыядычныя выданні (яны неабходныя для выканання дадатковых заданняў).

Па дарозе ў інтэрнат, у якім я да гэтага часу жыву адна, сустракаю аднагрупнікаў (яны праспалі і не прыйшлі на заняткі). Рушым у «Макдональдс». Ну, раз за месяц можна, галоўнае каб не ўвайшло ў звычку.

Бліжэй да вечара вырашаю, што сёння спаць ноччу не буду — трэба выканаць шмат заданняў.

***14/11/2013***

Ранак сустрэла з падручнікам па псіхалогіі. У 7 гадзін захацелася спаць… Кавы няма... Добра мець такіх жа «аднадумцаў», як і я, і жыць у адным інтэрнаце з імі. Сусед з іншага паверху — аднагрупнік Антон — падзяліўся кавай.

…Дзень прайшоў не самым лепшым чынам. Ніколі не паўтарайце мой подзвіг! Спіце ноччу! Першы семінар па псіхалогіі. Такое адчуванне, што ўсе не спалі ноч.

***15/11/2013***

Нягледзячы на тое, што прачнулася а 5 гадзіне, умудрылася спазніцца на 10 хвілін на практычны занятак. Нешта я часта стала спазніцца, ды і ўвогуле — з-за вельмі мяккага ложка не прыходзіць на некалькі пар. Трэба выпраўляцца!

Трэніроўка. Сон. Канспекты. Ежа. Сон.



Халадзільнік ужо не такі «вясёлы».

***18/11/2013***

Сёння дзень быў амаль свабодны, паколькі наша група праходзіць медкамісію. У метро сустрэла Аляксандра (аднагрупнік, мой зямляк). Пасля медагляду я аформіла пуцёўку ў студэнцкі санаторый-прафілакторый БДУ. Мяне ён прывабіў усім: харчаваннем, вітамінамі, працэдурамі. Тым больш санаторый гэты знаходзіцца за пяць хвілін хадзьбы ад інтэрната. Пасля паехала ва ўнівер паглядзець аб'явы. А далей — Нацыянальная бібліятэка. Вырашыла, што да яе закрыцця буду змагацца з кантрольнай па дысцыпліне «Руская мова. Сродкі масавай камунікацыі». Але праз некалькі гадзін даведалася, што ў Інстытуце журналістыкі здымаюць нейкую перадачу з удзелам вядомага выканаўцы — Аляксандра Рыбака. Як мне стала крыўдна, што я знаходжуся на іншым баку Мінска…

Этнаграфічная вечарына.



Але Каця не была б Кацяй, калі б не паехала і не паспрабавала хоць бы адным вокам пабачыць «зорку». Праўда, пасля такой удачы атрымалася неспадзяванка — на адной з ліній метро нейкі час не хадзілі цягнікі. Да інтэрната дабіралася наземным транспартам.

***19/11/2013***

Была на запісе перадачы «Гарады, якія спяваюць. Другі сезон». Пашчасціла з месцамі: за спінай былі суддзі праекта. Другі ці трэці раз прысутнічаю на такога кшталту мерапрыемствах. Люблю назіраць, як праходзіць запіс, як працуюць аператары, вядучыя, выканаўцы… Не менш «урадлівым» быў і вечар пасля перадачы. Я з некалькімі ахвотнымі крышку пастаяла каля службовага ўваходу. Вынік — поціск рукі ад Гнацюка, гутарка з Ціхановічам, вітанні з групай «Лайтсаўнд» і абдымкі з Рыбакам. Лічу, што мне як будучаму журналісту патрэбны такія знаёмствы.



Новы пакой: прасторны, утульны.

Амаль апоўначы гатую «вячэру». Голад дае пра сябе знаць… Смажу мяса, як вучыў тата, гатую салат, як мама. Сумую па іх. Вельмі.

***21/11/2013***

Вось ведаю, што трэба спаць ноччу!.. Але атрымалася нейкае дэжавю. У ноч перад псіхалогіяй і антычнай літаратурай не спала. Задаю сабе пытанне: а ці стала мне ад гэтага лягчэй на занятках? Адказваць амаль немагчыма — мозг не спраўляецца з інфармацыяй, а сэрца ад кавы ўжо калоціцца. І пасля заняткаў рушу ў бібліятэку… Дрэнная ідэя. Як толькі аказалася ў сваім пакоі — доўгачаканы сон.

…Забылася, што сёння стыпендыя. Бывае і такое…

***22/11/2013***

Вечарам у фае пятага паверха ладзілася мерапрыемства. Усё так добра супала ў маіх планах! Збіралася пабачыцца з сяброўкай, і трэба было ад «Журфактаў» прыйсці на этнаграфічную вечарыну. Натанцавалася: падыспан, полька… Жывая музыка. На некалькі гадзін мы быццам апынуліся ў вясковай хаце. Шмат моладзі, мала месца, смех, жарты, гульні. Аж дух захапіла!

…У інтэрнаце мяне чакаў сюрпрыз. Суседка, якая павінна са мной жыць, пакуль не збіраецца гэтага рабіць. Нават крыўдна стала… З другога боку — добрая навіна. Я застаюся жыць адна ў сваім пакоі!

***25/11/2013***

Не мой дзень. Не адшукаўшы талона на праезд у тралейбусе, я заплаціла штраф (мінус у тыднёвым бюджэце). Дзверы вагона метро сёння вырашылі зачыніцца менавіта на мне. Плечы прынялі ўдар. Самым крыўдным аказалася і тое, што ў Нацыянальнай бібліятэцы, куды я ехала, сёння санітарны дзень…

***29/11/2013***

«Дзіва! Такога ў маёй практыцы яшчэ не было!» — так адрэагаваў Уладзімір Канстанцінавіч Касько, выкладчык «Асноў журналістыкі», калі ўбачыў мяне адну на пачатку заняткаў. Мне самой не менш цікава было, дзе ж мае аднагрупнікі? Сёння яны аказаліся чамусьці не пунктуальнымі.

У інтэрнаце спужаў сігнал аб пажарнай эвакуацыі. І менавіта з-за яе я раней запланаванага паехала на аўтавакзал. Гэта я зразумела, калі зірнула на табло адпраўлення транспарту… ужо знаходзячыся на месцы.

Дадому! Нарэшце! Адпачну! І зраблю сюрпрыз бацькам — прыеду без папярэджання.

***1/12/2013***

Першы дзень зімы. Што каляндар, што надвор'е — усё супадае. Разам з зімой адчуваю падаражанне квітка да сталіцы. Мне, як студэнтцы, гэта не вельмі, скажам так, даспадобы. Адна з прычын, чаму дома бываю не так часта, — менавіта кошт праезду.

***7/12/2013***

Незвычайныя выхадныя. Папершае, я хварэю, таму план схадзіць у бібліятэку замяняю на пасцельны рэжым. Па-другое, у мяне з'явіліся суседкі! Вось якія, гэта другое пытанне. Дзве кітаянкі, якія не разумеюць ні рускай, ні англійскай моў…

***10/12/2013***

Суседкі прапанавалі паабедаць разам. Ежа смачная, але вельмі вострая. А нейкі ласунак (нагадвае курагу ў жэле) спадабаўся больш за ўсё. Увечары напала хандра. Усё больш хвалююся за сесію. Каб дапусцілі. Усё здаць. Толькі б не стаць неўротыкам. Усё ж такі для атрымання вышэйшай адукацыі патрэбныя моцныя нервы. Дзе іх браць, я не ведаю…

Збіты рэжым. І калі спаць хацела ў гадзіну ночы, то заснуць а трэцяй ужо немагчыма.

***12/12/2013***

Публікацыя ў «Чырвонцы». З гэтай вучобай нават і забылася, што дасылала штосьці ў рэдакцыю.

…Проста пачынаю шукаць сябе наноў. Ужо ў іншым горадзе, з іншым рытмам жыцця. І захоўваць свае звычкі пры ўсіх гэтых фактарах — проста немагчыма…

**Кацярына ЛЯСУН.**
**Фота аўтара.**

*Прагрэс — вучэбнаму працэсу*

# ВЫКЛАДЧЫКІ І СТУДЭНТЫ — У ІНТЭРАКТЫВЕ

## ...заснуць на лекцыі ўжо не атрымаецца

**Адукацыйны праект «Разумны клас» стартаваў на факультэце камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР пры падтрымцы кампаній «МТС» і Samsung. Мэта праекта — стварыць інтэрактыўнае асяроддзе, якое дазволіць максімальна уцягнуць усіх удзельнікаў у навучальны працэс дзякуючы абмену інфармацыяй у рэжыме рэальнага часу.**




На практыцы «Разумны клас» уяўляе сабой сістэму звязаных паміж сабой па бесправадной сетцы электронных прылад: інтэрактыўнай дошкі і планшэтаў ці ноўтбукаў. Вучэбны працэс абапіраецца на выкарыстанне менавіта гэтых дэвайсаў без прымянення падручнікаў і традыцыйных канспектаў.

Samsung прадаставіў для абсталявання вучэбнай аўдыторыі сваю інтэрактыўную дошку, а для студэнтаў — гібрыдныя планшэты ATIV Smart PC 5. Але да інтэрактыўнай дошкі могуць падключацца не толькі прылады Samsung, наадварот, «Разумная школа» ствараецца максімальна даступнай для прылад самых розных вытворцаў.

**Пры правядзенні тэсціравання выкладчык можа ўжо праз некалькі хвілін вывесці вынікі паспяховасці на экран інтэрактыўнай дошкі.**

Сістэма, напрыклад, дазваляе студэнтам задаваць выкладчыку пытанні ў электронным фармаце непасрэдна падчас занятку, не адцягваючы яго ад чытання лекцыі. Усе дасланыя пытанні адлюстроўваюцца ў спецыяльным акенцы на экране інтэрактыўнай дошкі. А інфармацыя, якая дэманструецца на інтэрактыўнай дошцы, у сваю чаргу адлюстроўваецца на ўсіх уласных мабільных прыладах.

Выкладчыкі фактычна атрымалі эфектыўны інструмент як для кіравання навучальным працэсам і арганізацыі групавой работы ў аўдыторыі, так і для кантролю за паспяховасцю. Так, студэнты пры дапамозе звязаных паміж сабой планшэтаў і інтэрактыўнай дошкі могуць прадэманстраваць выкладчыку хатняе заданне, паказаць яму дзеянне напісаных імі праграм. Пасля лекцыі студэнты атрымліваюць на свае прылады тэсты для праверкі засвоенай інфармацыі. Пры правядзенні тэсціравання выкладчык можа ўжо праз некалькі хвілін вывесці вынікі паспяховасці на экран інтэрактыўнай дошкі. Таксама, дзякуючы сістэме, выкладчык мае магчымасць адаслаць усім слухачам лекцыі хатняе заданне ў электронным варыянце.

Для БДУІР праект быў бясплатным, хоць пэўныя намаганні для адаптацыі праграмнага забеспячэння і вучэбных праграм прыкласці ўсё ж давялося. Па словах намесніка дэкана факультэта КСіС па вучэбнай рабоце Аляксея Ляшчова, гэта толькі першы крок. Наступным стане прапанова кантэнту, адаптацыя лекцый і стварэнне віртуальных лабараторый.

Без сумнення, «Разумны клас» знойдзе шырокае распаўсюджванне ў сістэме адукацыі дзякуючы таму, што сістэма лёгка адаптуецца пад патрэбы той ці іншай навучальнай установы.

Адказваючы на пытанне журналістаў, ці не стануць новыя тэхналогіі каталізатарам яшчэ большага дыстанцыявання педагогаў і вучняў, Аляксей Ляшчоў канстатаваў: «Тут важны разумны падыход. «Разумны клас» — толькі інструмент, прымяненне якога трэба камбінаваць з жывымі зносінамі ў аўдыторыі. Але відавочна, што свет змяняецца, ён ужо зусім іншы. І нам, удзельнікам адукацыйнага працэсу, трэба не адставаць ад прагрэсу»...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*З «базай» у галаве*

# «ЗАГУГЛІЦЬ» УЛАСНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

**Міжнароднае спаборніцтва па праграмаванні Code Jam, якое праводзіцца пры падтрымцы сусветнага інтэрнэт-гіганта Google, сёлета адзначыла сваё дзесяцігоддзе. Менавіта юбілейны конкурс стаў трыумфальным для Беларусі: пераможцам Google Code Jam стаў выпускнік факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ Іван МЯЦЕЛЬСКІ, які апярэдзіў на шляху да перамогі 45 тысяч канкурсантаў з усяго свету. Карэспандэнт «Чырвонкі» сустрэўся з Іванам для таго, каб распытаць яго пра перамогу і пагаварыць пра перспектывы спартыўнага (і не толькі) праграмавання ў Беларусі.**


Фота Надзеі БУЖАН.

***— Іван, раскажы, што такое спартыўнае праграмаванне і чым яно адрозніваецца ад традыцыйнага?***

— Агульных момантаў шмат, кропак дотыку — таксама. Але галоўнае адрозненне ў тым, што на алімпіядах праграмісты рашаюць складаныя задачы (часам ніяк не прывязаныя да рэальнага жыцця) на хуткасць. Бывае, праўда, і іншыя правілы. Фарматаў існуе шмат, але гэта — асноўны. Задачы даволі складаныя. Па сутнасці, гэта матэматычныя галаваломкі. Усё робіцца на камп'ютары, адказам становіцца код, які потым правяраецца на працаздольнасць. У гэтым заключаецца праграмісцкі элемент.

Існуюць розныя фарматы спаборніцтваў па спартыўным праграмаванні: камандныя і асабістыя, студэнцкія і «для ўсіх».

***— Ці можна назваць спартыўнае праграмаванне прафесіяй?***

— Ні ў якім разе. Але яно можа дапамагчы знайсці працу таленавітым праграмістам. Пасля Google Code Jam да мяне паступіла некалькі прапаноў ад сур'ёзных кампаній, у тым ліку ад Google. Увогуле, спаборніцтвы такога тыпу звычайна і праводзяцца для таго, каб «нагледзець» сабе новых супрацоўнікаў. Яшчэ бывае, што якой-небудзь кампаніі трэба вырашыць складаную і нетрадыцыйную задачу. Яны збіраюць восць такіх алімпіяднікаў, прызначаюць тэрмін здачы і «ўкідваюць» задачу. Каманды шукаюць шляхі рашэння, пераможца атрымлівае грошы і, магчыма, прапанову аб уладкаванні на працу. Але ў чыстым выглядзе гэта не больш, чым хобі.

***— А ці ёсць верагоднасць, што спартыўнае праграмаванне стане папулярным відам спорту, як гэта ў свой час адбылося з кіберспортам?***

— Думаю, што не. У алімпіядах па праграмаванні адсутнічае, напэўна, галоўны элемент спорту — відовішчнасць. Нікому не будзе цікава глядзець, як натоўп «гікаў»* друкуе на маніторы нікому незразумелы код. З кіберспортам сітуацыя іншая: там можна страляць, біцца, і ўсе гэта бачаць і разумеюць. Узяць нават тыя ж шахматы: большасць людзей хаця б мінімальна ведае, што гэта такое, ведае правілы, як ходзяць фігуры, і гэтак далей. А радкі праграмнага кода нікога не цікавяць, акрамя спецыялістаў. Таму я ўпэўнены, што алімпіяды застануцца алімпіядамі.

***— Што трэба зрабіць, каб стаць спартыўным праграмістам?***

— У першую чаргу — зацікавіцца. У мяне ўсё пачыналася са школьных алімпіяд, потым была ўніверсітэцкая каманда. Паступова выйшаў на яшчэ больш сур'ёзны ўзровень.

**Лепшымі ў свеце пакуль што застаюцца расіяне, кітайцы, японцы, палякі, але з намі як мінімум лічацца.**

***— Іван, ты вельмі доўга ішоў да гэтай перамогі, займаў восьмае месца, у пазамінулым годзе ўзяў «серабро» і вось, нарэшце, перамога. У чым сакрэт поспеху?***

— Вялікай розніцы паміж удзельнікамі фінальных этапаў няма. Проста камусьці ў пэўны дзень шанцуе, і ўсё ў яго атрымліваецца, а камусьці — не вельмі. Зрэшты, да Code Jam я ніяк не рыхтаваўся, бо ўся патрэбная база ў мяне была. Проста так склалася, і я стаў пераможцам.

***— Ці вялікі ўнёсак у гэтую перамогу зрабіў факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ? Магчыма, самаадукацыя ў гэтай сферы больш важная?***

— Я не хачу вельмі крытыкаваць свой універсітэт, але адна з яго задач — своечасовае абнаўленне курсаў па дысцыплінах, асабліва ў такой сферы, як інфарматыка. Мне ўніверсітэт даў пэўную структурызацыю ведаў, навучыў арыентавацца ў сферы. Таму самым карысным для сябе я назваў бы першы курс. Другі — ужо менш. Далей — зусім мала карыснага. Справа ў тым, што я не вучыўся ў іншых ВНУ і крытыкаваць абгрунтавана наўрад ці магу. Але лічу, што поспехі нашых (і не толькі) хлопцаў — гэта ў большай ступені іх уласныя дасягненні.

Іншая справа, што нашы ўніверсітэты вельмі любяць паспаборнічаць адзін з адным якраз у сферы алімпіяд.

***— І ёсць чым ганарыцца?***

— Безумоўна. Сёлета каманда БДУ на сусветным конкурсе праграмістаў сярод студэнтаў ACM ICPC заваявала «серабро», а 19-гадовы Генадзь Караткевіч (беларус, зараз студэнт Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта ІТМО) увогуле адзін з лепшых спартыўных праграмістаў у свеце. Лепшымі ў свеце пакуль што застаюцца расіяне, кітайцы, японцы, палякі, але з намі як мінімум лічацца.

***— У вытворчасці камп'ютарных складнікаў Беларусь вельмі адстала ад вядучых краін. Магчыма, настаў час выходзіць на першы план у вытворчасці праграмнага забеспячэння? Тым больш, што ў спартыўным праграмаванні, па тваіх словах, поспехі ёсць...***

— А з вытворчасцю «софта» і так усё добра. Беларусь у гэтым сэнсе адна з вядучых краін. Не ведаю, праўда, якую ролю ў гэтым адыграла стварэнне Парка высокіх тэхналогій, але IT-кампаніі ў Беларусі растуць як на дражджах. Прычым гэта як кампаніі, якія робяць праграмнае забеспячэнне для іншых праектаў, так і тыя, што ствараюць уласныя. Вельмі добры прыклад — сусветна вядомая Wargaming з яе World of Tanks («Светам танкаў»). Існуюць такія кампаніі, як EPAM Systems, у якіх офіс знаходзіцца ў Амерыцы, а ўвесь штат — у Беларусі. Так выгадней, бо тут праграмісту можна плаціць значна меншыя грошы, але ў беларускіх рэаліях гэта ўсё адно будзе вышэй за сярэдні заробак.

***— Нядаўна ў адным з расійскіх часопісаў паведамілі, што Мінск — гэта адзіны ў свеце горад, дзе дзяўчаты ў клубах шукаюць менавіта праграмістаў...***

— Не ведаю, ці праўда гэта, але калі яны кіруюцца крытэрыем фінансавай забяспечанасці, то магчыма. Праца праграміста прыносіць вялікія, па нашых мерках, заробкі, хоць і не заводлачныя. Прычым для гэтага неабавязкова шукаць буйную кампанію. Я, напрыклад, адмовіўся ад працы ў Google, бо лічу, што адэкватна ацаніць магчымасці і ўнёсак асобнага праграміста можна толькі ў невялікай кампаніі, дзе ўсе навідавоку. Google — гэта гігант, там працуюць дзясяткі тысяч «кодараў», і праца лепшых там незаўважная.

***— А як наконт стэрэатыпу, што праграмісты — гэта людзі, якіх нічога, акрамя камп'ютараў, не цікавіць?***

— Не ведаю, ва ўсіх па-рознаму. Я, напрыклад, у вольны час магу паглядзець фільм. Іграю на піяніна. Ну і, вядома, магу «пастраляць» у камп'ютарнай гульні. У клубы не хаджу, кавярня ці рэстаран — мой максімум.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

*«Гік» — (ад англ. Geek) чалавек, які празмерна нечым цікавіцца ці захапляецца. Ужываецца пераважна ў дачыненні да людзей, празмерна зацікаўленых камп'ютарамі.*

*Была іншая восень*

# СОНЦА... АД НЕЗНАЁМЦА

**Восень бывае рознай: яркай, маляўнічай, з мноствам рознакаляровага лісця, якое шапаціць пад нагамі. А бывае як сёння. Калі холадна, вільготна, некамфортна і самотна.**

Раніца пачыналася як звычайна. Пад'ём, потым у ванны пакой, кубак кавы — і да тэлевізара: паглядзець прагноз надвор'я. Дождж. Значыць, прыйдзецца апранаць куртку і браць у школу парасон. Праўда, пра парасон я ў выніку забылася, так што дзень не заладзіўся ўжо з самай раніцы...

Адсядзеўшы сем урокаў у школе, нарэшце іду дахаты. Стыхія бушуе. Лье праліўны дождж, а як вы памятаеце — я без парасона. Уся мокрая, з растрапанымі валасамі і чорнымі «слязьмі» тушы на твары, заходжу ў паўпусты аўтобус. Выбіраю месца каля акна, насупраць нейкага хлопца з нататнікам. Навошта яму нататнік у аўтобусе? А зрэшты — гэта зусім не важна.

Кроплі, якія сцякаюць па шкле, наводзяць мяне на разважанні. Я надзяваю навушнікі і заплюшчваю вочы... Ну чаму мне так не шанцуе? Ізноў шэрая паласа. А што мне трэба? Усяго толькі трохі цяпла, разумення ці... маленькі цуд. Збіраць букеты з сухога рознакаляровага лісця, шпацыраваць з сябрамі, смяяцца без нагоды...

Вось і мой прыпынак. Хлопец, які сядзеў насупраць, ужо выйшаў. Падыходзячы да дзвярэй, я заўважаю яго нататнік, пакінуты на пашарпаным сядзенні. Што ж, не толькі мне сёння не шанцуе. Справіцца з цікаўнасцю не магу і хапаю нататнік. Дождж ужо скончыўся, выглянула сонца.

Прыйшоўшы дахаты і зрабіўшы ўрокі, я ўспамінаю пра забыты нататнік. Тое, што я ў ім прачытала, прымусіла мяне ўсміхнуцца: «Не журыся, усё будзе добра!» І маленькае, намаляванае ў кутку ліста сонца.

Напэўна ён мае рацыю: заўтра будзе іншая восень.

**Арына КАГАЛЁНАК, вучаніца 10 класа наваполацкай гімназіі №2.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
24 12 2013 г.

# «КСЯНДЗОМ МОЖА СТАЦЬ ТОЛЬКІ САПРАЎДЫ ДОБРЫ ЧАЛАВЕК»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

— Ведаеце, мяне спачатку накіравалі на практыку ў родны Нясвіж, — сядаючы за працоўны стол, пачынае гутарку Раман. — Але пасля вырашылі, што працы больш будзе менавіта ў сталіцы, таму перанакіравалі.

**— Цікава, і ў чым заключаецца практыка семінарыста?**

— Гэта больш блізкае азнаямленне з тым, што чакае мяне наперадзе. У семінарыі пераважаюць тэарэтычныя заняткі. Дысцыпліны, што мы вывучаем, вельмі адрозніваюцца ад тых, якія выкладаюць у іншых навучальных установах. Першыя тры гады мы праходзім філасофскія навукі, а пасля — тэалагічныя. Іспыты здаём двойчы на год. Шпаргалкі? Скарыстацца імі вельмі цяжка. У нашай установе не так шмат людзей, каб за імі можна было схавацца і нешта спісаць. Тым больш экзамены збольшага вусныя, а не пісьмовыя.

У касцёле праводжу заняткі па катэхізацыі з дарослымі, дзецьмі, дапамагаю святарам на набажэнствах, сустракаюся з людзьмі, якія прыходзяць да нас па сваіх справах. Распарадак дня рухомы. У графіку набажэнстваў нічога не мяняецца, але мы не можам прагназаваць, што кожную раніцу ў 10:00 адбудзецца хрост, а праз гадзіну — шлюб. Часта людзі тэлефануюць і просяць, каб святар тэрмінова прыехаў да хворага. І калі да нас звяртаюцца, мы адразу пытаемся пра час, які падыходзіць людзям, а ўжо пасля глядзім, ці атрымліваецца ў нас. Напрыканцы практыкі мой куратар — ксёндз, які ўвесь час сочыць за маім духоўным станаўленнем, напіша характарыстыку, і на пачатку новага навучальнага года я павінен буду прад'явіць яе ў семінарыі, дзе адміністрацыя зробіць выснову, ці была гэтая практыка плённай.



На практыцы клерыкам неабходна не толькі дапамагаць ксяндзам на набажэнствах, але і быць сакратаром і службай інфармацыі ў адной асобе.

Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

**— А ці былі характарыстыкі, у якіх семінарыстаў крытыкавалі?**

— Не. Звычайна практыку праходзяць усе добра. І ў гэтых лістах не так шмат крытычных заўваг. Але ўсё роўна прысутнічаюць пэўныя моманты, на якія куратар просіць звярнуць увагу.

**— Яшчэ зусім нядаўна вы сядзелі за школьнай партай, а цяпер дапамагаеце ў касцёле, рыхтуеце сябе да святарскага жыцця. Калі зрабілі гэты важны духоўны выбар?**

— Я паходжу са звычайнай беларускай праваслаўна-каталіцкай сям'і. І так атрымалася, што спачатку хадзіў у царкву, а ўжо пасля пачаў хадзіць у касцёл. Памятаю свае ўражанні ад знаёмства са святарамі, клерыкамі, якія праходзілі практыку ў Нясвіжы. Ужо тады я зацікавіўся семінарыяй. Прыкладам у святарстве для мяне стаў ксёндз Гжэгаж Каласоўскі, які доўга працаваў у Нясвіжы. Ён памёр у 1991 годзе. На жаль, я яго не ведаў, але ў памяці засталіся бабуліны гісторыі, і ў пэўных справах мне б хацелася быць падобным да яго. А блаславёны Папа Ян Павел ІІ, які ў красавіку будзе аб'яўлены святым, з'яўляецца для мяне прыкладам асаблівай прастаты, з якой ён ставіўся да людзей. Мой тата працуе машыністам на «Белтрансгазе», маці — наглядчыцай у Нясвіжскім замку. Сам я калісьці займаўся дзюдо, удзельнічаў у школьных спаборніцтвах па футболе, «хварэў» за нясвіжскі «Верас», аднак вырашыў, што буду паступаць у семінарыю.

**— Цікава, як паставіліся да вашага выбару сябры-аднакласнікі?**

— У маім класе было амаль 20 вучняў, і з іх толькі трое былі каталікамі. Безумоўна, да пэўнага часу яны не ведалі, куды я пайду вучыцца пасля школы. І толькі ў адзінаццатым класе зразумелі, што я хачу звязаць жыццё са святарствам. Цяпер, калі сустракаюся з імі, адчуваю, што яны ўзрадаваны тым, што нехта з класа пайшоў у жыцці менавіта гэтым шляхам.

Што да іншых людзей, на вуліцы звычайныя мінакі часам неяк дзіўна рэагуюць на чалавека ў сутане. Нехта адразу вітаецца, хтосьці ўважліва пазірае, пытаецца: «Адкуль вы тут узяліся?» Насамрэч дзіўная сітуацыя, бо касцёл дзейнічае на Беларусі здавён, а не ўсе ведаюць, як выглядае ксёндз.

**— Як лічыце, для сяброў вы застанецеся аднакласнікам Ромам ці станеце айцом Раманам?**

— Складанае пытанне. Калі нядаўна бачыў школьных сяброў, напачатку адчувалася нейкае хваляванне, але потым усё пайшло добра. Мы шмат гадоў правялі разам, і нават калі яны мяне будуць называць ксяндзом, у душы для іх усё роўна буду заставацца Ромам.

**— Чуў пра выпадкі, калі людзі з вялікім жаданнем ішлі ў семінарыю, у ордэн, але пасля збочвалі з выбранай сцяжыны і вярталіся да свецкага жыцця.**

— Шэсць гадоў падрыхтоўкі ў семінарыі патрэбны для таго, каб малады чалавек разважаў, задумваўся аб сваім жыццёвым выбары, зразумеў, ці сапраўды святарства — яго прызванне. Можа, яму насамрэч будзе лепш працаваць інжынерам на прадпрыемстве. І яшчэ не было такіх выпадкаў, каб чалавек, які не хоча вучыцца, працягваў далей гэта рабіць пад прымусам, бо гэтага хочацца яго сваякам.

> **І правы кіроўцы, і аўтамабіль, дапамагаюць не абцяжарваць людзей, якіх неабходна наведаць. Так, людзі могуць прыехаць за табой у касцёл, аднак больш зручна, калі наведаеш іх сам.**

**— Перад тым, як клерык становіцца сапраўдным ксяндзом, ён складае шэраг абяцанняў перад епіскапам.**

— Сярод іх — паслухмянасць епіскапу і ўсім яго наступнікам, захоўванне цэлібату, штодзённая малітва... Так склалася на працягу стагоддзяў, што святар толькі праз цэлібат мусіць прысвяціць жыццё служэнню Богу і людзям. У сямейным жыцці зрабіць гэта цяжка, бо даваўся б разрывацца паміж домам і касцёлам. Знайсці час на малітву было б таксама складана.

**— Многія пастары сваім прыкладам паказвалі, якое насамрэч сціплае жыццё вядуць ксяндзы. Праўда, часам людзі пазіраюць на аўтамабілі, якімі кіруюць святары, і пачынаюць казаць аб тым, што іх жыццё далёкае ад прыкладаў сапраўднай сціпласці.**

— Сціпласць, безумоўна, павінна быць. А матэрыяльны дабрабыт — гэта толькі часовая з'ява. Аўтамабіль у святара мусіць быць хаця б з той прычыны, што ён павінен выязджаць па патрэбе некалькі разоў на дзень. Я не лічу, што святары, як праваслаўныя, так і каталікі, ездзяць на дарагіх аўтамабілях. Падобнае можа быць за мяжой, аднак не ў Беларусі. Мой пробашч казаў мне, што і правы кіроўцы, і аўтамабіль, дапамагаюць не абцяжарваць людзей, якіх неабходна наведаць. Так, людзі могуць прыехаць за табой у касцёл, аднак больш зручна, калі наведаеш іх сам.

**— Упэўнены, у вас, як і любога маладога чалавека, ёсць свая жыццёвая мара...**

— Я не люблю загадваць наперад. Але хачу, каб праца, якую буду рабіць, ішла на карысць Божую і дапамагала чалавеку ў яго патрэбах.

**— Нядаўна бачыў артыкул з загалоўкам «Пісьменнікамі нараджаюцца»...**

— Аднак ксяндзом дакладна не нарадзішся. Толькі пасля інтэлектуальнай і духоўнай падрыхтоўкі ў семінарыі можна стаць святаром. Праўда, ксёндз найперш павінен быць добрым чалавекам, які здольны любіць іншых людзей. Калі ў кандыдата на святарства дабрыні нестае, у працы яму будзе вельмі складана.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

# ХЛЕБНАЙ ДЗЕІ ЧАРАЎНІК




**Пірог з начынкай і ржаны каравай Кастусь ЛАРКОЎ спёк спецыяльна для «Звязды» — журналісты «размялі» іх за лічаныя хвіліны.**

## ЧЫСТАЯ «ХІМІЯ» І ТРОХІ МАГІІ

Гледзячы на вырабы Кастуся, складана паверыць, што яны — вынік строгіх стандартаў і тэхналогій. Падаецца, што гэтыя пірагі маюць сваю душу. І каб яна «пасялілася» ў духмяным бохане, недастаткова толькі строга прытрымлівацца рэцэптуры, а трэба яшчэ, каб чараўнік-пекар дадаў які-небудзь сакрэтны інгрэдыент або сказаў магічныя словы. Але Кастусь рассейвае мае ўяўленні аб таемнай пякарскай магіі.

— Тут працуюць тыя ж стандарты і тэхналогіі. Але ж асаблівa аздоблены выраб і на смак будзе падавацца лепшым за неўпрыгожаны бохан.

У той жа час, калі ўзяць цеста для звычайнага батона і пэўным чынам яго згарнуць, то пры выпяканні іначай будуць праграввацца слаі, а значыць, такі бохан па смаку таксама будзе адрознівацца ад звычайнага, — пасвячае мяне Кастусь у «хімію» хлебапякарства.

І ўсё ж пекар прызнаецца: пірагі, якія ён робіць дома, адрозніваюцца ад спечаных ім на працы.

— Калі я пяку дома, то не прытрымліваюся ніякай рэцэптуры — усё ў маёй галаве. Вынік бывае розны: у хатніх умовах духоўка не мае такіх магчымасцяў, як печы на працы, таму можа нешта не атрымацца. Але калі і бываюць «хібы», то пра іх звычайна ведаю толькі я сам.

Здавалася б, з такімі здольнасцямі можна ўвесь час выпякаць хлеб да ўласнага стала. Але Кастусь набывае яго ў краме і адзначае, што гэтыя вырабы ў нас выдатныя. Але асаблівы парад па выбары хлеба спецыяліст не дае: кажа, што ў кожнага свае густы і гэтай справе.

— Пры пакупцы можна звярнуць увагу на этыкетку: там пазначаны стандарт, па якім зроблены бохан. Як на мой густ, вельмі добрыя вырабы з пазнакай «Хлябы беларускія нацыянальныя» (той жа «Нарачанскі»).

І ўсё ж некаторыя аматары свежай выпечкі аддаюць перавагу папулярным цяпер хлебапечкам. Аднак у Кастуся да іх неадназначнае стаўленне.

— Па якасці хлеб у хлебапечцы не атрымаецца такім, які выпякаюць на заводзе, бо там прасочаць, каб цеста добра настаялася і каб трэшчыны падчас выпечкі не з'явіліся. А хлебапечка проста працуе па зададзенай праграме.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ПІРАГА ШУКАЕШ, А ХЛЕБА НЕ ЦУРАЙСЯ

Паводле слоў майстра, на Беларусі хлеб спрадвеку выпякалі жанчыны. Але замясіць цеста было справай нялёгкай як у фізічным сэнсе, так і праз наяўнасць мноства прымхаў і звычаяў. Сярод іх вельмі важным быў (і застаецца) настрой, з якім выпякаеш хлеб.

— У дзень, калі я ведаю, што буду нешта выпякаць, стараюся быць стрыманым, не вырашаць ніякіх спрэчак. Бо калі ты ў спакойным стане працуеш з цестам, то і выраб атрымаецца добры. А калі нервуешся, то і на цесце гэта адаб'ецца.

Кастусь кажа, што людзі паступова вяртаюцца да традыцый. Так, быў час, калі каравай на вяселлі саступіў месца торту. Але цяпер усё часцей замаўляюць і тое, і другое. Бо каравай спрадвеку нёс у сабе глыбокую сімвалічнасць. Раней у хату нявесты спецыяльна запрашалі жанчын-каравайніц, сярод якіх абавязкова прысутнічала хросная маці дзяўчыны, пры гэтым усе яны павінны былі мець шчаслівы лёс. Вядома, так ужо не робяць, але ж пэўных звычаяў пры выпечцы вясельных пірагоў Кастусь прытрымліваецца і цяпер.

— Калі пячэш каравай на вяселле, нельга сварыцца, каб гэта не паўплывала на лёс маладых. А яшчэ цеста для такога вырабу нельга мясіць кулакамі — каб муж жонку не біў. Раней, каб жыццё было вясёлым, у цеста дадавалі гарэлку, але я гэтага не раблю. Ну і абавязкова на каравай павінна быць выкладзена доля маладых: дзве птушкі, шмат розных кветак — каб жыццё было яркім і разнастайным. Гэтую «долю» павінны з'есці толькі самі жаніх з нявестай.

Дарэчы, уся «мадэль» каравая нашых продкаў адлюстроўвала сувязь пакаленняў. Долю маладых сімвалізаваў верхні ярус. Сярэдні атаясамліваўся з бацькамі і блізкімі сваякамі, ніжні ярус — з далёкімі родзічамі. Таму часта крытыкуюць вясельныя шмат'ярусныя торты: іх «паверхі» размяшчаюць на падстаўках, якія нібы разрываюць гэтую сувязь.

А яшчэ пры вырабе вясельнага пірага трэба было як мага больш весяліцца, каб і маладым жылося весела. Чаго не скажаш пра выпечку ржанога бохана: падчас гэтай дзеі ў хаце павінна быць поўная цішыня, забаранялася нават хадзіць без патрэбы. Непажадана было і ляжаць на печы ў час выпякання, бо гэта магло дрэнна адбіцца на якасці хлеба. Такога асаблівага стаўлення да яго цяпер, пэўна, і не сустрэнеш. Але Кастусь Ларкоў імкнецца аб ім нагадаць і нават вядзе адмысловы блог, пачытаўшы які немагчыма не пераканацца, што хлеб над усім пануе.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
**Фота аўтара.**

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

Сам сабе дызайнер

# СКРАПБУКІНГ: «МАТЭРЫЯЛЬНЫЯ» ЎРАЖАННІ

**...Перада мной стаіць некалькі немаленькіх скрынак, у якіх — кветачкі, стужкі, пацеркі, папера і яшчэ безліч рэчаў, прызначэнне і назвы якіх для «чужых» застаюцца загадкай. Вось адна прылада, напрыклад, адначасова падобная да мясарубкі і... гільяціны, а на самой справе з яе дапамогай выразаюць з паперы «карункавых» матылькоў для скрапбукінгу. Што значыць гэтае слова, якія выдаткі нясе ў сабе такое хобі і чаму некаторыя беларусы пакуль што «пужаюцца» рэчаў ручнога вырабу, карэспандэнту «Чырвонкі» расказала Ганна Літвіновіч, захоплены сваёй справай «скрапбукер», а разам з тым — будучы ландшафтны дызайнер і «крыніца» арыгінальных падарункаў для родных і сяброў.**



— Першы раз скрапбукінг я пабачыла ў адным часопісе. Там друкавалі вельмі шмат інфармацыі пра хобі: ад вышыўкі стужкамі да арыгамі. Мне чамусьці запомніўся скрапбукінг, і пасля, ужо калі стала вучыцца ў Мінску, знайшла ў адной сацыяльнай сетцы аб'яву пра набор на курсы. З таго часу прайшло два гады, — расказвае Ганна.

Загадкавая «неайчынная» назва паходзіць ад слова «скрапбук». Гэта такі альбом для наклейвання «выразак» з газет і часопісаў, фотаздымкаў, паштовак і ўсяго, што дарагое як памяць. Нехта творчы і англамоўны трансфармаваў гэтае паняцце да фотаальбома, кожная старонка якога — скончаная думка-ўражанне пра пэўную падзею. Акрамя здымка пра яе можа нагадваць што заўгодна — стужкі, сухія пялёсткі кветак, каменьчыкі (калі іх удасца прымацаваць). Прыкладна так скрапбукінг і з'явіўся. Сённяшнія майстры фотаальбомамі не абмяжоўваюцца. Можна ствараць, напрыклад, запрашэнні, рамкі для фота, нататнікі. Робяць падобным чынам і паштоўкі. Гэтае мастацтва хоць і блізкае да скрапбукінгу, але называецца іншым словам — **кардмэйкінг**.

Мінімум для таго, хто хоча заняцца скрапбукінгам, — наяўнасць спецыяльнай паперы, стужак, пацерак, карунак, але калі захапленне не становіцца пастаянным, то гэты мінімум «разрастаецца» да бясконцасці. Напрыклад, Ганна захоўвае матэрыялы для сваёй творчасці ў шматлікіх скрынках і пакунках. Калі іх усе дастаць з паліц, гадзіну на вывучэнне «зместу» можна патраціць дакладна.

— Я не лічыла, колькі грошай пайшло на матэрыялы. Тры мільёны рублёў ці каля таго дакладна набярэцца, — расказвае Аня. — Я стараюся замаўляць усё на расійскіх ці ўкраінскіх сайтах, там цэны крыху меншыя, чым у Беларусі, — працягвае мая суразмоўца. — Так што з дзяўчатамі-майстрыхамі мы звычайна аб'ядноўваемся і робім адну вялікую замову, а выдаткі за дастаўку дзелім на ўсіх пароўну.

Як можна зразумець, матэрыялы для скрапбукінгу — задавальненне нятаннае: адзін ліст паперы можа каштаваць некалькі тысяч рублёў. Але спрактыкаваныя людзі ведаюць, што шматлікія рэчы, якім належыць стаць часткай рукатворнай прыгажосці, можна здабыць абсалютна бясплатна. Напрыклад, у Ані так атрымліваецца з пацеркамі: шмат іх знойдзецца, калі разабраць старыя каралі ці бранзалеты. А яшчэ можна папрасіць сваякоў, каб дапамаглі (Ганна шмат пацерак атрымала ад сястры). Таксама бясплатныя — сухія кветкі (за лета можна нарыхтаваць на цэлы год), а ролю прыгожай паперы паспяхова выканаюць старонкі часопісаў, а ў некаторых выпадках — нават старая газета.

Летась на свята горада ў Мінску Аня ўдзельнічала ў кірмашы майстроў.

— Цікаўных было шмат, але людзі больш глядзелі, чым набывалі. Згадваю пакупнікоў, якія прыходзілі і адразу прасілі: «Мне гэта, гэта і яшчэ вунь тую рамачку!» І ўсё ж у большасці выпадкаў амаль кожнаму падабаўся знешні выгляд альбомаў, запрашэнняў, а вось кошт «пужаў». Зразумела, купіць паштоўку за 30 тысяч рублёў адважыцца не кожны. Што зробіш, ручная праца не можа каштаваць танна.

**Загадкавая «неайчынная» назва паходзіць ад слова «скрапбук». Гэта такі альбом для наклейвання «выразак» з газет і часопісаў, фотаздымкаў, паштовак і ўсяго, што дарагое як памяць.**

Для такога карпатлівага хобі, як скрапбукінг, патрабуецца не толькі «творчая жылка», але і немалая колькасць часу. Таму майстраваць прыгожыя рэчы такім спосабам многія пачынаюць тады, калі з'яўляюцца вольныя гадзіны. Напрыклад, у дэкрэтным адпачынку.

— На курсах у маёй групе было некалькі цяжарных жанчын. Яны вучыліся з разлікам на тое, каб было чым сябе заняць, акрамя хатніх клопатаў. А калі пашанцуе, то і грошай крыху зарабіць, ствараючы рэчы на замову, — гаворыць Ганна. — З вопыту знаёмых я ведаю, што прадаць свае вырабы па добрым кошце — гэта рэальна.





Ствараць свае шэдэўры часам даводзіцца самымі нечаканымі спосабамі.

— Ёсць цікавая і складаная тэхніка, якая называецца **эмбросінг**. Спачатку на патрэбны вам штампік наносіцца чарніла, усё гэта пераносіцца на паперу, пасля чаго на яшчэ мокры надпіс ці малюнак патрэбна насыпаць пудру для эмбросінгу і высушыць спецыяльным фенам. Той, якім дзяўчаты сушаць валасы, для гэтай справы не падыходзіць, — дзеліцца сакрэтамі Ганна.

Яшчэ можна «старыць» паперу з дапамогай спецыяльнай фарбы, рабіць цісненне, выразаць фігурнымі нажніцамі прыгожыя ўзоры, прашываць на швейнай машынцы лісты альбомаў...

Калі здаецца, што гэта проста нерэальна зрабіць, значыць, вам абавязкова трэба паспрабаваць. Як паказвае жыццё, у скрапбукінг часам уцягваюцца тыя, ад каго гэтага зусім не чакаеш... Адна з апошніх вялікіх замоў, што рабілі Ганне, — 45 запрашэнняў на вяселле стрыечнага брата. Той спачатку моўчкі назіраў за працай, а пасля на хлопца «сышло натхненне», і ён сам уключыўся ў працэс. Надзвычай цікава было назіраць за высокім сур'ёзным вайскоўцам, які выразаў з паперы матылькоў...

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

Фокус у кадры

# КАЛІ ЗАМЕСТ ПЭНДЗЛЯ — СВЯТЛО

**...У поўнай цемры бачыць адно аднаго дапамагаюць толькі слабыя рознакаляровыя водбліскі агнёў-ліхтарыкаў. За маёй спінай дзве дзяўчынкі водзяць імі ў паветры, малюючы загадкавыя фігуры. Яшчэ адзін чалавек «шаманіць», з усяе сілы размахваючы невялічкай лямпай, што блішчыць прыглушаным зялёным святлом і шабуршыць пры кожным руху, нібы сапраўдная магічная прылада. Нарэшце мы дачакаліся галоўнай, найбольш яркай успышкі, падобнай да маланкі. Можна прыпыніць гэты загадкавы «абрад»...**

## Нябачнае воку

...Усе вышэйзгаданыя падзеі здарыліся са мной падчас візіту ў Рэспубліканскі цэнтр тэхнічнай творчасці ў Мінску. Менавіта такім «чараўніцтвам» займаюцца выхаванцы фотамастака і загадчыка фотавідэалабараторыі Канстанціна Яўгенавіча Нетылёва, каб навучыцца рабіць фота ў тэхніцы «фрызлайт». Журналісту таксама дазволілі паспрабаваць...



У перакладзе з англійскай мовы слова «фрызлайт» значыць «застылае, замерзлае святло». Настроіўшы на фотаапараце доўгую вытрымку, можна на фота зафіксаваць тое, чаго ніколі не ўбачыць вока — узор, намаляваны святлом.

— Фотаапарат павінен стаяць нерухома. На штатыве ці якой-небудзь стойцы, — распавядае Канстанцін Нетылёў. — Каб зрабіць малюнак ці надпіс, падыходзіць, лічы, любы «светлавы пэндзаль». Напрыклад, ліхтарык ці святлодыёд. Нельга толькі лазерам карыстацца, бо ён вельмі яркі і можа пашкодзіць матрыцу фотаапарата. Тым, хто трымае ліхтарыкі, пажадана апранаць цёмнае адзенне і нават шапкі. Некаторыя вучні ў якасці крыніц святла карыстаюцца спецыяльнымі прыстасаваннямі для фаер-шоу ці бенгальскімі агнямі, але я не раю, паколькі гэта вельмі траўманебяспечна. А ўсё тое, што свеціць без агню, — калі ласка.

У спрактыкаваных аматараў фрызлайту ёсць свае хітрасці. На звычайны ліхтарык, напрыклад, можна прычапіць каляровы фільтр (з тканіны, паперы ці пластыку). Таксама часам прымацоўваюць ліхтар унутр пластмасавай цацкі ці праколваюць іголкай на шчыльнай паперы дзіркі ў форме матылька, а пасля ставяць гэты трафарэт перад ліхтаром. Адну і тую ж крыніцу святла можна «інтэрпрэтаваць» па-рознаму.

## Цуды вытрымкі і фантазіі

Калі вы задумваецеся заняцца фрызлайтам, не патрэбна набываць дарагую тэхніку, і зусім не абавязкова — лічбавую. Адзіная ўмова: у фотаапараце павінна быць магчымасць уручную настроіць вытрымку. Гэта неабходна для таго, каб на працягу некалькіх секунд намаляваць перад фотааб'ектывам патрэбны ўзор святлом.

Выкладчык мастацкай фатаграфіі Рэспубліканскага цэнтра тэхнічнай творчасці Ігар Іваноў паказвае фотаздымак-нацюрморт, які стварылі яго выхаванцы:

— Гэта была эксперыментальная работа. Мы задзейнічалі некалькі чалавек і некалькі ліхтарыкаў. Да іх прыкладваўся чырвоны фільтр, а бутэльку падсвяцілі сінім колерам.

Яшчэ мы карысталіся аранжавай лінейкай, якая свеціцца ў цемры. Каб атрымаць цікавую выяву, патрэбна эксперыментаваць. Самае складанае — тэхнічны бок, а ўзоры і малюнкі — гэта творчы працэс.

Дарэчы, «калектыўнасць» у фрызлайце — зусім не дзіва. Каб зрабіць цікавы здымак, патрабуецца група. Часам адну работу могуць «маляваць» 15 — 20 чалавек. Той, хто кіруе праектам, расстаўляе ўсіх удзельнікаў па месцах, пасля робяцца пробныя здымкі: нехта малюе літару, нехта — іншы патрэбны элемент. Часцей за ўсё добры вынік атрымліваецца на пятым-шостым кадры. Прычым выпраўляць ці дамалёўваць нешта ў фоташопе недапушчальна. Галоўнае ў працы — гэта дзеянні, зробленыя падчас здымкаў.

## Фота — на ўсё жыццё

Ствараюць «светлыя» здымкі выхаванцы Канстанціна Нетылёва не толькі ў мастацкіх мэтах. У гуртку ёсць цікавая традыцыя: калі ў кагосьці з удзельнікаў дзень нараджэння, усе разам робяць для яго «фрызлайт-паштоўку». Імянінніка ставяць у кадр, крыху «падсвечваюць» і пішуць святлом яго імя.

Нягледзячы на тое, што асноўнае месца заняткаў — Цэнтр тэхнічнай творчасці, супрацоўнікі фотавідэалабараторыі праводзяць майстар-класы на тэматычных зменах у лагеры «Зубраня» на Нарачы. Вельмі многія з тых, хто знаёміцца там з фрызлайтам, не пакідаюць гэты занятак і ўвогуле, працягваюць займацца фатаграфіяй.

Некаторыя паступаюць у Акадэмію мастацтваў, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Інстытут журналістыкі БДУ і іншыя навучальныя ўстановы, дзе можна атрымаць прафесію, звязаную з фотамастацтвам. Займацца ў фотавідэалабараторыі, дарэчы, могуць прыходзіць не толькі студэнты і школьнікі, а ўсе зацікаўленыя маладыя людзі да 31 года.

— Заняткі ў нас бясплатныя, калі не лічыць той тэхнікі, якую кожны набывае для сябе па сваім гусце і магчымасцях, — расказвае Канстанцін Яўгенавіч.

Па яго назіраннях, апошнія 5-6 гадоў сярод захопленых фатаграфіяй становіцца ўсё больш дзяўчат, і ў навучальныя ўстановы з «фатаграфічным» профілем ідуць навучацца пераважна яны.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**
**Фота прадастаўлена фотавідэалабараторыяй Рэспубліканскага цэнтра тэхнічнай творчасці.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
24 12 2013 г.

# ЁН ЗАЎСЁДЫ ІШОЎ НАПЕРАДЗЕ...

**(З успамінаў маці)**

**Мой родны горад... Вечар, гучыць музыка. Я гуляю па вуліцах, зазіраю ў вітрыны, мяркую, у якую з кавярняў можна завітаць, каб пасядзець у крэсле за столікам з кубачкам кавы і памарыць. Але не... Майская квецень вабіць прыемным водарам. Чаму б не пайсці на тэрыторыю нашай знакамітай сельгасакадэміі і не ўбачыць сапраўдную прыгажосць? Зараз вясна. А там так цудоўна! Адчыняю браму, дзе ўзвышаецца адмысловая арка. І вось ён, цуд! Парк аздоблены маладой зелянінай. Удыхаю чыстае, празрыстае паветра. Уздымаюся на пагорак, а там пачынаюцца дамы, якія з'яўляюцца сведкамі даўніны.**

На прыступках аднаго з іх позірк мой спыніўся. Дом патанае ў прыгожай квецені, а на прыступках сядзіць чалавек і спакойна чытае часопіс. Пытаюся ў сябе: «А чаму на ім спыніўся мой погляд?». Здаецца, звычайны стары, які нічым не вылучаецца сярод астатніх. Але не. Ён не падобны да іншых! Ці то па засяроджанасці позірку асветленых знутры вачэй, ці то па твары, аднак я ўбачыла перад сабой асобу. Змястоўную. Мудрую. Ён быў апрануты ў лёгкі пінжак, на нагах боты. Упрыгожвала твар доўгая сівая барада, гладка расчасаная. Стары сядзеў не горбячыся. Ва ўсім яго абліччы адчувалася нерастрачаная сіла, не прыглушаная сямю ці васьмю дзясяткамі гадоў. Густыя сівыя бровы над вачыма. Адкрыты шчыры позірк. «Прыгожы дзядуля», — адзначыла я. Аказваецца, і старыя людзі бываюць прыгожыя! Затым я параўноўвала гэтага дзядулю ў натоўпе з іншымі, такога ж узросту, як і ён. Падобнага не знайшла.

Праз некаторы час мой родны горад святкаваў Дзень Перамогі. На мітынг каля помніка загінулым у гады Вялікай Айчыннай вайны сабралася шмат гараджан. Сярод іх былі ветэраны. І раптам мой позірк выхапіў з натоўпу майго знаёмага дзядулю. Ён быў у святочнай вопратцы, а на грудзях зіхацелі ордэны і медалі. І куды падзелася старасць? Стаяў ён прама, быццам захоўваў раўненне ў страі. Нібы малады салдат, які даваў клятву на вернасць Радзіме, дзядуля горда трымаў галаву. Сівыя валасы былі прычасаны, а вочы — адкрытыя і чыстыя, як бясхмарнае неба. Цяпер ён мне нагадаў мужнага, валявога, з цвёрдым характарам чалавека. Не ведаючы яшчэ, хто ён такі, стала ім ганарыцца. Ганарыцца тым, што дзядуля жыве ў маім горадзе, што я буду бачыць яго час ад часу. Вядучы запрасіў дзядулю да мікрафона і прадставіў: «Дзмітрый Фёдаравіч Вайстроў, наш зямляк, камандзір партызанскага атрада «Зорка». Гаварыў дзядуля гучна, са спакойнай інтанацыяй. Так кажуць людзі, упэўненыя ў сабе.

Усё яго аблічча сведчыла пра вялікую сілу духу. Дзядуля расказваў пра сябе. Я сачыла за кожным яго рухам, за кожным словам. Пасля выступлення дзеці падарылі яму кветкі. І я ўбачыла, як ён усміхнуўся ў знак падзякі, як сабралася шмат маршчынак вакол яго ясных вачэй. Хтосьці з натоўпу сказаў: «Гэта ж той чалавек, які напісаў кнігу «Горацкае рэдкалессе». Пасля свята я знайшла кнігу ў бібліятэцы...

Дзмітрый Фёдаравіч Вайстроў — адзін з арганізатараў партызанскага руху ў Горацкім раёне ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Ён стварыў групу народных мсціўцаў, якая потым перарасла ў партызанскі атрад, на базе якога была сфарміравана брыгада «Зорка». Як камандзір Дзмітрый Фёдаравіч вылучаўся розумам, уменнем ладзіць з людзьмі, арганізатарскімі здольнасцямі. Надзвычай вытрыманы, ён заўсёды быў спакойны. Не цярпеў зайздрасці, падхалімства, усяго паказнога. Да вайны працаваў на партыйнай рабоце ў другім раёне. Але, як гаварыў ён пазней, «ёсць у маім жыцці вельмі важная паласа, пра якую не магу маўчаць. Гэта Вялікая Айчынная вайна, мой удзел у партызанскім руху супраць гітлераўскіх захопнікаў у родным Горацкім раёне. Вайну я сустрэў загадчыкам партыйнага кабінета Клічаўскага РК КП(б)Б. Як і многія партыйныя актывісты, я застаўся на акупаванай тэрыторыі, каб прадоўжыць змагацца з ворагам». Дзмітрый Фёдаравіч лічыў сваім абавязкам абараняць свой дом, сваіх родных. Яму думалася: «Буду побач — будзе спакайней родным». А роднымі ён лічыў усіх землякоў.

...Аднойчы Дзмітрыю Фёдаравічу неабходна было пайсці ў суседнюю вёску, каб наладзіць сувязь з мясцовымі партызанамі. Было небяспечна, бо вораг цікаваў за кожным. Адзін з жыхароў, якога немцы прызначылі старастам, параіў: «У мяне ёсць газета. Глядзіце, тут надрукавана аб'ява. Немцы запрашаюць у Оршу працаваць на чыгунцы. Вазьміце газету. Калі вас затрымаюць і будуць цікавіцца дакументамі, вы ім пакажаце гэту газету». Па дарозе камандзір з тугой аглядаў родныя краявіды. Вочы яго напаўняліся болем. Што яны нарабілі, нелюдзі? Дзе палі збажыны з сінімі вочкамі валошак? Дзе чыстыя крыніцы? Усё здратавана ворагам. Усё вынішчана.

Сэрца сціскалася. Праз некаторы час камандзір выйшаў да вёскі. Нямецкі патруль спыніў:

— Дакументы!

— Я іду працаваць на чыгунку.

Афіцэр паглядзеў у твар і аддаў дакументы і газету. Партызан паспешліва пайшоў.

Колькі іх, дарог, сцяжынак, сходжаных ім! Рызыкоўна, небяспечна, але сэрцам адчуваў камандзір, што яго падтрымка неабходная ўсюды.

Не раз выводзіў сваю брыгаду на заданні, не раз сустракаўся твар у твар са смерцю. Але заўсёды ён быў наперадзе сваіх байцоў, быццам прыкрываў іх ад варожай кулі.

Я чую крок камандзіра — асцярожны, упэўнены. Адчуваю ўсведамленне ім сваёй адказнасці. Я бачу засяроджаны яго позірк перад падрыхтоўкай аперацыі па вызваленні ваеннапалонных, лагер якіх размяшчаўся непадалёк ад Горак. Адчуваю трывогу, бо гэта адказнае заданне. І камандзір не спіць усю ноч, прадумваючы кожны крок.

Пасля заканчэння вайны Дзмітрый Фёдаравіч працаваў на розных пасадах. Затым выйшаў на пенсію, але гатовы быў адгукнуцца на просьбу кожнага, бо сэрца заставалася маладым і гарачым.

...Ішоў час. Зноў хацелася сустрэць цяпер ужо знаёмага старога чалавека. Але колькі ні ўзіралася я ў твары прахожых, яго не бачыла. «Няўжо?» — прамільгнула думка. Сапраўды, я даведалася, што дзядулі не стала...

У гарадской мітусні мы, маладое пакаленне, рэдка звяртаем увагу на людзей пажылога ўзросту. Звычайна назіраем за моладдзю... Але ёсць шмат людзей, вартых нашай увагі. Паспрабуйце зазірнуць ім у вочы...

Мая маці гэта зрабіла і ўбачыла перад сабой чалавека з незвычайна прыгожай і светлай душой. Яна перадала гэта святло мне. А я перадаю яго вам, дарагія чытачы.

**Наталля ПАТУПЧЫК, вучаніца 11 класа гімназіі № 1 г. Горкі.**

**ПРА АЎТАРА**

**— Вершы пішу з дзяцінства, але яны часцей толькі для сябе. Да прозы цікавасць прыйшла толькі зараз. Прыгадваецца нешта, расказанае мамай, прачытанае самой. Вось і гэты нарыс — успаміны маёй маці. Кранае заўсёды штосьці цікавае, не заўважанае раней. Звяртаю ўвагу на цікавых, незвычайных людзей, бо ў іх многаму можна павучыцца. І наогул я чалавек, якому хочацца шмат спазнаць, — гаворыць пра сябе Наталля.**

**Дзяўчына скончыла летась вакальна-харэаграфічную школу. Кажа, што на фартэпіяна можа іграць гадзінамі.**

**— Вельмі падабаюцца творы Баха, Моцарта. Напэўна, у іх я чэрпаю тую жыццёвую энергію, якая выліваецца ў творчасць. — Побач са мной крочыць па жыцці мая мама. З ёй мы ўдзельнічаем ва ўсіх святочных мерапрыемствах горада.**

**Аўтарцы 17 гадоў. Пасля заканчэння школы яна збіраецца паступаць у лінгвістычны ўніверсітэт.**




# ZUMBAМАНІЯ. ХУТКА І Ў ВАШЫМ ГОРАДЗЕ!

**У 1990-я гады ў сонечнай Калумбіі Альберта Перэс, ужо сусветна вядомы фітнес-інструктар, забыўся ўзяць з сабой музычны дыск для правядзення заняткаў, у сувязі з чым яму давялося скарыстацца тымі кампазіцыямі, якія былі пад рукой. Менавіта так і пачаў свой трыумфальны рух па планеце новы кірунак фітнесу — зумба. Гэтую гісторыю вам распавядзе любы танцор-пачатковец.**




«Зумба» ў перакладзе з англійскай (Zumba) — танцавальная фітнес-праграма, асновай якой з'яўляецца рытмічная музыка. Гарачыя сальса або рэгетон нікога не пакінуць на месцы.

Падчас заняткаў арганізм атрымлівае нагрузку рознай ступені інтэнсіўнасці, што дазваляе спальваць за трэніроўку ад 500 да 1000 калорый. Ці гэта не выдатна?

Сёння зумба — вельмі папулярны ў Амерыцы і Еўропе рух. У Беларусі яшчэ не многія ведаюць аб гэтай танцавальнай праграме, аднак колькасць яе прыхільнікаў пастаянна расце.

«Дзякуючы прастаце рухаў усяго за адну трэніроўку кожны можа навучыцца асноўным камбінацыям. У танцораў павышаецца самаацэнка і ўздымаецца настрой!» — дзеліцца з намі Алена Пруднікава, першы сертыфікаваны фітнес-інструктар міжнароднага класа па зумба ў Беларусі. Алена працуе ў наваполацкім фітнес-цэнтры. Першы раз яна даведалася аб гэтай праграме ў 2011 годзе на фітнес-канвенцыі ў Маскве. Калі зайграла музыка і іншыя інструктары пачалі танцаваць, Алена зразумела, што яе кліентам гэта спадабаецца. Таму ў студзені 2012 года яна зноў паехала ў Маскву, дзе праводзілася першае навучанне зумба, і стала сапраўдным «фанатыкам» гэтага кірунку.

Сапраўдны інструктар зумба заўсёды поўны энергіі. Ён зараджае групу несуцішнай прагай актыўнага жыцця. Знаходзіць да кожнага індывідуальны падыход, дапамагае парадай (напрыклад, па правільным харчаванні) і арыентуе на поспех. Добры трэнер заўсёды ў курсе апошніх фітнес-распрацовак. Ён прымае ўдзел у семінарах і канвенцыях. Фітнес — гэта яго лад жыцця, а не праца! Усё вышэйпералічанае можна сказаць пра Алену Пруднікаву.

Як яна расказала, вялікая ўвага пры навучанні інструктараў надаецца тэорыі: асновам анатоміі, фізіялогіі, траўматалогіі. Каб правільна даць кардыянагрузку і дапамагчы чалавеку дабіцца пастаўленай мэты без шкоды для здароўя, кваліфікаваны інструктар абавязаны ведаць, як функцыянуе арганізм чалавека. Па словах Алены, зумба прыцягвае лёгкасцю і стварае атмасферу, у якой кожны чалавек у кампаніі незнаёмых яму людзей адчувае сябе «сваім».

«Камбінацыя энергетыкі і музыкі, задавальнення і шчасця настройвае незнаёмых людзей на агульны лад, тым самым збліжаючы і дапамагаючы зносінам, — кажа Алена. — Ахвотных займацца гэтай танцавальнай праграмай вельмі шмат. Хто прыйшоў адзін раз, вяртаецца зноў і зноў!»

Паступова зумба становіцца ўсё больш папулярнай у нашай краіне. Калі вы яшчэ не на занятку па зумба, то бярыце спартыўную форму і бяжыце на трэніроўку, дзе вас чакаюць зарад станоўчай энергіі і добры настрой! Пашукайце зумба ў сваім горадзе!

**Настасся ПАДПОРА, вучаніца сярэдняй школы №7 г. Наваполацка.**

**ПРА АЎТАРА**

**Настассі 16 гадоў. Паводле яе слоў, захапляецца музыкай і журналістыкай. Таму, відаць, невыпадкова тэмай матэрыялу, дасланага на творчы конкурс «Чырвонкі», дзяўчына абрала новую фітнес-праграму, асновай якой з'яўляецца менавіта музыка. Што датычыцца сур'ёзнасці намераў адносна другога захаплення, Настасся наведвае школу журналістыкі «Залатое пяро» Палаца дзяцей і моладзі г. Наваполацка. Больш за тое, як кажа сама дзяўчына, «маёй мэтай з'яўляецца паступленне ў Інстытут журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Веру, што калі сапраўды хацець чаго-небудзь, то гэта абавязкова збудзецца!» Удачы, Настасся!**

*Мастацтва з балончыка*

# САМАВЫЯЎЛЕННЕ ФАРБАМІ...

**Цяпер амаль паўсюдна ў гарадах можна сустрэць графіці, а гэта значыць, што папулярнасць вулічнага мастацтва расце. Праз малюнак можна выказаць сваё меркаванне, свае пачуцці, погляды... Галоўнае пры гэтым — не забываць пра эстэтыку.**

У нашым горадзе таксама ёсць тыя, хто займаецца вулічнай творчасцю. Напрыклад, шаснаццацігадовы мастак Алег Яфрэменка.

— Графіці я займаюся ўжо два гады. Натхненне знаходжу ў музыцы, думках. Для мяне гэтае мастацтва — спосаб выказвання эмоцый, — распавёў юны мастак. — «Стрыт-артам» займаюцца і многія з маіх сяброў. Сярод іх ёсць нават дзяўчаты, хаця і няшмат. Некаторыя малююць не горш, чым хлопцы. Наяўнасць таленту ад узросту і полу не залежыць.

Да велізарнага шкадавання хлопца, у нашым горадзе зусім мала крам, дзе можна купіць усё неабходнае для творчасці. Гэтак жа не хапае і пляцовак для малявання.

Хаця графіці і набыло папулярнасць, меркаванне пра вулічную творчасць неадназначнае, што пацвердзіла праведзенае мной невялікае апытанне.

Так, з 35 апытаных маладых людзей 25 лічаць графіці мастацтвам. Чатыры чалавекі абыякава ставяцца да гэтага занятку, а 6 назвалі яго хуліганствам і вандалізмам. Сярод больш сталага пакалення 12 чалавек таксама не прызнаюць графіці мастацтвам. Адзін чалавек застаўся абыякавым. А большасць (23 чалавекі) назвалі насценны жывапіс своеасаблівай творчасцю.

Дык чаму б у такім разе не стварыць больш спрыяльных ўмоў для вулічных мастакоў? Калі знайсці пад «стрыт-арт» больш пляцовак, дык у моладзі будзе месца для творчасці, і на сцены дамоў ніхто спакушацца не будзе.

*Артыкул 341 Крымінальнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь «Апаганенне збудаванняў і пашкоджанне маёмасці» прадугледжвае за цынічныя надпісы ці адлюстраванні пакаранне грамадскімі работамі, ці штрафам, ці арыштам на тэрмін да трох месяцаў.*

**Арына КАГАЛЁНАК, вучаніца 10 класа наваполацкай гімназіі №2.**

**«Маладосць» друкуе дэтэктыў — з забойствам і містыкай, поўны іроніі і прыгожых сцэн кахання. Аўтар, Ганна Чакур, аграном па адукацыі і журналіст па пасадзе, піша вершы, казкі, апавяданні… Вельмі любіць дарогу да незвычайнага: слоў, рэчаў, адчуванняў, мясцін, да іншых людзей і да сябе.**



Ганна ЧАКУР

Урывак з аповесці

# У ЧАКАННІ ЭКСТРАСЭНСА

— «Аннушка разлила масло… Аннушка разлила масло… Аннушка разлила масло…» — мае крокі самі сабой клаліся на рытм булгакаўскай фразы. — Ап… Гэта апошні? Хутчэй за ўсё. Самы-самы апошні? Але мне няма яшчэ і трыццаці… Чаму менавіта я?..

Затое нарэшце знікнуць гэтыя пакутныя сны (і ў крытычнай сітуацыі небарака-розум спрабаваў намацаць пазітыў). Інтэрнэт-лаянка былога сябра больш не пакрыўдзіць, няхай сабе гаўкае…

Апошні дзень… Апошні светлавы? Ці ўсё ж дадуць дацягнуць да поўначы? Колькі цяпер? Ого! Ужо восем, значыць, у любым выпадку засталося няшмат… Ну і што далей? Куды мне цяпер? Каму прынесці свой страх? А можа, паспрабаваць схавацца? Падбегчы да чыгуначнай касы, купіць білет і затаіцца ў вагоне ўсё роўна якога цягніка. Абы як мага далей… Дурнічка! Калі лёсу захочацца, любая дарога прывядзе цябе ў загадзя вызначанае ім месца…

…Цёмна-зялёная «японачка» рэзка прытармазіла перад самым маім носам. Ого! А я, аказваецца, стаю на пешаходнай «зебры»… І як даўно? Давай, тэпай, нецярплівы замахаў рукой дысцыплінаваны вадзіцель. І я паслухмяна, амаль на аўтапілоце, патэпала. «Аннушка разлила масло… Аннушка разлила масло…» — сам сабой вярнуўся рытм крокаў…

Спалохацца я не паспела. Нагогул не зразумела, што адбылося — надсадны роў матора, незразумелы бліскучы рух і ўдар тугой хвалі паветра… Усё адбылося імгненна, вось толькі падала я чамусьці доўга-доўга. Прайшла цэлая вечнасць, пакуль маё цела нарэшце грымнулася на асфальт і стомленая свядомасць правалілася ў выратавальную цемру…

— Дзяўчыну збілі… Байкер… Пайшоў на абгон на пешаходным пераходзе… Сволачы! На вуліцу з-за іх не выйдзеш… Як яна, бедная?.. Міліцыю выклікалі?

Вяртацца ў рэальнасць не хацелася: якое ўсё ж такі шчасце — мець магчымасць не думаць… Але хтосьці настойліва, хоць і не моцна, ляпаў мяне па шчоках. Так што вярнуцца давялося.

…Частакол людскіх ног адгарадзіў перспектыву. Мая галава ляжала на чыіхсьці каленях.

— Жывая? — незнаёмыя вочы колеру добра запаранай кавы паглядалі на мяне з трывогай.

— Жывая… Не турбуйцеся… Пусціце… Дазвольце, я пайду…

— Якое «пайду»! — абурыўся мой ратавальнік. — Ды вы так грымнуліся, што на асфальце, пэўна, увагнутасць засталася… У вас палова касцей пераламана — не інакш. Проста ў шоку боль не адчуваецца… Зараз прыедзе «хуткая». І міліцыя. Ну і дзянёк у вас сёння!

Дзянёк? Госпадзі! Успаміны вярнуліся і стоп-кадрамі замігцелі ў свядомасці: фіялетавы твар экстрасэнса, раздушаная парэчкі…

— Не трэба «хуткай», — узмалілася я. — І міліцыі не трэба. Прашу вас. Я не магу… Не маю часу… Мне зусім мала засталося… Адпусціце…

Наўрад ці на выратавальніка падзейнічала гэтая няскладная просьба. Верагодна, у маіх вачах ён заўважыў штосьці такое, што прымусіла яго змяніць рашэнне.

— Сядайце ў машыну, падкіну вас дадому, — хлопец адчыніў перада мной дзверку сваёй іншамаркі. — Сядайце-сядайце. Смялей…

Натоўп відавочцаў пачаў расчаравана расцякацца адразу ва ўсіх кірунках. Гукі ДАІшнай сірэны набліжаліся.

— Хутчэй, прашу вас, — я амаль што плакала.

— Не пытанне!

Мой ратавальнік націснуў на «газ», і яго аўтамабіль паслухмяна ўліўся ў бліскучую стужку сабе падобных.

— Куды загадаеце? — наўмысна жартаўлівым тонам спытаўся ён.

— Не ведаю… Праўда… Вы не падумайце, я ў норме… Проста такая сітуацыя… Я не хачу дамоў… Мне страшна застацца адной… — я больш і не спрабавала стрымліваць слёзы. — Высадзіце мяне вось тут, на праспекце… Я пайду… Прабачце… Я сама…

— Гэ-э-эй! А ну супакойцеся! — гаспадар машыны на хаду нахіліўся і выцягнуў з бардачка пакецік сурвэтак. — Прапаную вам наведаць адну кавярню. Утульную. Маю любімую. У гэты час у ёй не бывае шматлюдна.

…У прыбіральні я паспрабавала «пачысціць пёркі». Куды там! Чырвоныя ад слёз вочы, распухлы нос, шырокая — на ўсю шчаку — драпіна… Так, джынсы можна паспрабаваць замыць… Халера, не адмываюцца! А што рабіць з парванай майкай? Стоп, у сумачцы павінен быць шалік…

— Ну вось! — узрадаваўся мой ратавальнік. — Зусім іншы выгляд… Сядайце, я ўжо зрабіў заказ…

Праз пару хвілін на стале з'явіўся келіх чырвонага віна. Яшчэ праз імгненне да яго далучыліся два кубачкі кавы і талерка з пірожнымі.

— Вам трэба крыху выпіць, — адказаў на маё нямое пытанне візаві. — Шчыра кажучы, не перашкодзіла б і мне — усё ж адбывалася на маіх вачах… Але я за рулём… Давайце, не саромейцеся. Дарэчы, як ваша імя? Паралелімся з вамі ледзь не гадзіну, а ўсё інкогніта…

— Майя. А ваша?

— Дзяніс. Ну што, самы час адзначыць знаёмства?.. — Ён чокнуў кубкам кавы ў мой келіх з віном.

Віно было нечакана добрым, аксамітным.

— Амброзія! — ад асалоды я заплюшчыла вочы.

— Ну, давайце, — у вачах колеру кавы нарадзілася пытанне. — Што здарылася? Адкуль расце гэта вашае «зусім мала засталося»? Расказвайце-расказвайце. І майце на ўвазе, я — чараўнік, які ўмее разагнаць любыя хмары. Нават самыя аблокныя і свінцовыя. Ну…

І пра што я магла яму расказаць? Пра ідыёцкую варажбу нейкай Сямёнаўны? Ці пра ўласны ідыятызм, з якім я «купілася» на гэты старанна разыграны спектакль?

— Глупства, пане дабрадзею, — паспрабавала аджартавацца.

— Папярэджваю: адмаўчацца не атрымаецца, — скорчыў наўмысна грозны твар Дзяніс.

За акном, ля якога стаяў наш столік, пайшоў дождж. Густы і спакойны. Грыбны. А ў кавярні ненавязліва загучала музыка: I was here… I lived, I loved. I was here… Здаецца, Беёнсэ…

Віно сагрэла і разняволіла. І, калі спявачка зноў пачала паўтараць прыпеў, нечакана для самой сябе я загаварыла. Спачатку саромеючыся, стараючыся падбіраць найбольш адпаведныя словы. Пра трагічную смерць бацькоў, пра ўласную адзіноту. Пра куленепрабівальную сцяну, якой адгарадзілася ад мяне жыццё (ці я ад яго?). Пра няўменне не пакутаваць ад бясконцых думак і пра стому жыць. Пра сон, які вяртаецца зноў і зноў. Пра былога добрага сябра, што аніяк не спыніцца выліваць на мяне бруд толькі таму, што аднойчы нашы дарогі разышліся. Пра свае страхі. Пра Сямёнаўну і яе дзікую варажбу…

На вітрыне крамы насупраць дагараў дзень. Кавярня паступова запоўнілася людзьмі, і музыка ў яе дынаміках пагучнела. А я ўсё гаварыла. Глядзела ва ўважлівыя вочы колеру кавы і гаварыла, не думаючы, пра што. Словы сыпаліся з мяне самі, нібы ў нейкай унутранай прасторы, дзе яны, нявыказаныя, збіраліся, ад перапоўненасці прарвалася дзірка…

***

…Дзяніс падвёз мяне да дома. І нават праводзіў да ўваходных дзвярэй. На развітанне ўзяў за руку, і мы доўга стаялі моўчкі. Нарэшце ён лёгкім пацалункам дакрануўся да маіх пальцаў:

— Ты не адна. Цяпер не адна… Разумееш, Майя, якімі б адзінокімі мы сябе ні лічылі, побач з намі заўсёды ёсць нехта, гатовы падзяліць нашы радасці і боль. Трэба толькі азірнуцца, каб яго ўбачыць. Лёс паслаў табе сёння гэтага байкера, можа, толькі дзеля таго, каб ты змагла азірнуцца…

У кватэру я зайшла шчаслівай. Вось так. Вось так! Я сказала гэта, я выплюхнула. І ён не высмеяў, не адвярнуўся. Ён зразумеў. І я цяпер не адна!!!

«I was here… I lived, I loved. I was here…» — спявала я, стоячы пад душам і змываючы са скуры ўласнае мінулае, якое стала раптам зусім не патрэбным.

…Клац-клац… Ад дотыкаў маіх пальцаў камп'ютар прачнуўся і выдаў інфармацыю: прыйшлі тры новыя лісты і ў сацыяльных сетках шмат абнаўленняў. Зноў ты, Адаме? Усё яшчэ пенішся злосцю? Ну і Бог з табою! Шрамы ад тваіх слоў загаіліся! Ты больш не маеш нада мной аніякай улады!

Так, традыцыйная шклянка малака нанач — здаецца, яно пачало працаваць. Грымаса ў люстэрку — і я з разбегу заскочыла ў ложак. Як звычайна, пачытаць нанач? Не сёння! Я стамілася…

«І гэтая стома шчаслівая!» — яшчэ паспела падумаць я і праваліласяў сон. У глыбокі-глыбокі сон без аніякіх мучыцеляў і праследаванняў.

Разбудзіў мяне грукат. Абсалютна неверагодны. Нібы нехта молатам біў у стальную рэйку…

Аўтаматычна зірнула на электронны цыферблат — 2.08. Дрыжачай рукой намацала кнопку начніка і ўключыла святло. Біў насценны гадзіннік. Стары. Ён перадаваўся ў нашай сям'і з пакалення ў пакаленне. Быў свайго роду сямейнай рэліквіяй. І… І ён ніколі не ішоў — прынамсі, нават мая бабуля не памятала гэты гадзіннік спраўным. Грамавыя ўдары ніяк не змаўкалі, білі, здавалася, па галаве. А стрэлкі сышліся на лічбе 12. Няўжо ў тэрміну, вызначанага нам лёсам, свой адлік?

Не панікаваць, не панікаваць! Нельга! Ці мала што бывае.

Не адводзячы вачэй ад гадзінніка на сцяне, пацягнулася да начнога століка, на які перад сном заўсёды клала мабільнік. Рука натыкнулася на нешта іншае. Значна большае. І… Баючыся паверыць ва ўласную здагадку, я марудна павярнула галаву…

Сцэны пакоя закружыліся ў вар'яцкім рытме, але замест адчайнага крыку маё горла змагло нарадзіць толькі тоненькі мышыны піск.

Затое літаральна праз імгненне ва ўсю моц заенчыў дзвярны званок.

*Дарога да веры*

# МНЕ СНІЦЦА АНЁЛ…

**Раніца была ясная і быццам абяцала нешта прыемнае. Я стаяла, накінуўшы на плечы лёгкі шалік. Хацела хутчэй ужо дабрацца да месца адпачынку і зліцца разам з прыродай. Так даўно марыла, што нарэшце застануся адна. Уся гэтая мітусня навявала на мяне сумныя думкі і стамляла. Вось і аўтобус — своечасова. Уладкоўваюся: мяккае крэсла, любімая музыка ў плэеры…**

— Вы да Мірнага? — спытаў спакойны прыемны голас. Я падняла вочы: да мяне падсаджвалася пажылая жанчына.

— Так, — адказала я. — А вы? — і тут жа падумала: сумная кампанія…

— І я ў Мірны. Добрае месца, для душы, — усміхнулася жанчына, і я злавіла яе позірк.

Ніколі раней мне не даводзілася бачыць такога позірку: было ў ім нешта незвычайнае, няўлоўна прывабнае і такое цёплае і душэўнае, што мне захацелася пагутарыць з гэтым чалавекам.

Дарога мелася быць доўгай, і мы размаўлялі. Час праляцеў незаўважна. Ад спадарожніцы зыходзіў спакой, мне было прыемна і ўтульна побач з ёй, я слухала гэты меладычны голас, зазіраючы ў яе дзівосныя вочы…

Я даведалася, што жанчына служыць у храме Мірнага. Мо таму ў яе такі незвычайны позірк?

— Вера заўсёды будзе з табой, — сказала мне на развітанне спадарожніца.

І хто скажа, што гэтая сустрэча была выпадковасцю? Чыстага душой сустрэць — гэта вялікая рэдкасць у наш час, а мне пашчасціла. Для мяне гэтая сустрэча стала пачаткам важнага шляху — шляху да веры.

…Дзіўныя істоты — людзі… Калі нам добра, мы не заўважаем тых, каму кепска, у каго гора, але крыўдзімся, калі ў нас бяда, а хтосьці абыякавы. На жаль, мы не цэнім таго, што маем, а страціўшы — пакутуем.

Смерць брата перавярнула і маё жыццё. Усё змянілася… Змянілася я, мае погляды. Я ўжо даўно перастала шмат гаварыць, імкнуся больш рабіць.

Наступным крокам на шляху да веры ў Бога было хрышчэнне ў царкве. Дакладней, два хрышчэнні: маё ўласнае і калі я стала хроснай маці маёй пляменніцы. Гэта адны з самых важных у маім жыцці падзей.

У кожнага чалавека павінна быць вера. Па-іншаму не можа быць — без веры няма сэнсу. Вера ў Бога прыходзіць не да ўсіх, дакладней, да яе трэба самому прыйсці. Вера ў Бога дапамагае паверыць у сябе, адчуць сябе больш устойлівым і моцным. Жыць з верай — значыць жыць з Богам.

Я хаджу ў храм… Ніколі раней не адчувала такой унутранай патрэбы ў веры. А цяпер яна заўсёды са мной, я па-іншаму гляджу на свет, я стала больш спакойнай і памяркоўнай, я імкнуся дапамагаць людзям. І калі ў мяне будзе складаны дзень або трэба прыняць важнае рашэнне, мне сніцца анёл…

**Кацярына ЛЯСУН.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

SEX–БАЛЯСЫ

# ХАЧУ СВАЮ СНЯГУРКУ!



**Набліжаецца час, калі нават рэдкі дарослы, няхай недзе і ў глыбіні душы, не спадзяецца на невялікі цуд, — Новы год... Не, можна, вядома, і не спадзявацца, а самому ўвасобіць мары і памкненні ў жыццё. Замовіць, напрыклад, на свята эратычную Снягурку. Ці нават лепш дзвюх! Вой, прабачце, гэта я зараз услых сказаў?!. Ну, вы ж ведаеце, што дзяцінства заканчваецца тады, калі хочацца, каб жаданні выконваў не Дзед Мароз, а Снягурка. Гэта для дарослых хлопчыкаў. А для такіх жа дзяўчат — стрыптыз ад самога Дзеда Мароза. Зараз і такое магчыма... Але гэта, пагадзіцеся, нейк не зусім натуральна. У нашай традыцыі верыць у тое, што доўгачаканы цуд адбудзецца сам па сабе і менавіта з намі. А з кім жа яшчэ? Мы ж заслужылі! Памятаеце даўні тост-анекдот: «Давайце пажадаем, каб на нас напала зграя баксаў. (А мы не здолелі ад іх адбіцца!». Таму пад бой навагодніх курантаў ці падчас варажбы на святкі, напэўна, не адзін і не адна загадаюць і такое: абавязкова сустрэць у наступным годзе сваю другую палавінку...**

Кажуць, некалі чалавек спалучаў у адным цэлым і мужчынскі, і жаночы пачатак, але потым Бог за нейкую правінасць падзяліў яго. І з таго часу мы шукаем па свеце менавіта сваю палавінку. Як у анекдоце: «Цалуюцца ў цемры двое. «Як цябе завуць?» — Сярожа. — Цьфу, мяне гэтаксама». Не-не-не, не падумайце нічога такога!... Ніякіх «адценняў блакітнага». Сёння нашы нататкі «пафарбаваны» выключна адным колерам — перадначаваным. Проста ўжо і навукоўцы даказалі, што мы на падсвядомым узроўні шукаем сярод прадстаўнікоў процілеглага полу падобных сабе. Рысамі твару, характару. Светаўспрыманнем. Нават калі іншы чалавек як быццам цалкам твая процілегласць, ён усё роўна можа нечым прыцягваць. Гэта азначае толькі тое, што тыя ж рысы характару хацеў бы мець і ты.

**Трэба ўзяць у пэўных прапорцыях страсці, дадаць кахання, на смак — пацалункаў і абдымкаў. Страву рэкамендуецца паспрабаваць удваіх, лепш за ўсё — у ложку.**

На працы якраз нядаўна каляжанка заўважыла, што мы з жонкай — аднолькавыя, маючы на ўвазе нашы прафесійныя падыходы. Хаця, па праўдзе, не такія мы ўжо і аднолькавыя. Трэба ж мець нейкія няроўнасці (я пра характары!), каб «іскру высякаць»... Дарэчы, бацькі той самай каляжанкі пазнаёміліся менавіта ў навагоднюю ноч. Пачалі сустракацца, а праз год ажаніліся. Так што навагоднія казкі і сапраўды здараюцца ў жыцці.

...Праўда, загадваючы жаданне, трэба быць асцярожным з імі. Дакладнасць — найперш! А то можа атрымацца, як было ў нашай кампаніі. На святкі неяк вырашылі паваражыць. І адна незамужняя дзяўчына, якая не ўтойвала, што хацела б выйсці замуж, выцягнула паперку з уласнаручна дагэтуль напісанай фразай: "Не спяшайся, а тое паспееш!». Пасмяяліся, падзівіліся, але ніякага тлумачэння прадказанню даць не змаглі. А фраза тая «расшыфравалася» літаральна некалькі гадзінамі пазней, пра што мы даведаліся наступным днём... Вярталіся мы з гасцей позна, калі вуліца была ўжо амаль пустая, а святлафоры мігалі ў дзяжурным рэжыме. Высадзілі яе насупраць «Рыгі» — яна якраз жыла на тым баку вуліцы побач з універсамам. Дзяўчына потым расказвала: «Думаю — чаго ісці на пешаходны пераход, хаця ён і быў літаральна побач... Вуліца ж пустая, нікога няма. Пайшла напрасткі. І неяк не заўважыла, што іду... роўна ў напрамку міліцэйскай машыны, прыпаркаванай на тым баку... Аштрафаваць мяне, вядома, не аштрафавалі, але «лекцыю» прачыталі добрую. Хлопцы, відаць, у нарадзе крыху засумавалі...» Знаёмства, як нехта мог падумаць, не атрымалася. Выйшла як у тым анекдоце: «На «чорным рынку» з'явіліся фальшывыя ёлачныя ўпрыгажэнні. Выглядаюць як сапраўдныя, але радасці ад іх няма». З таго часу фраза «Не спяшайся, а то паспееш» стала ў нас крылатай...

І яшчэ пра варажбу і асцярожнасць. Неяк раней адна знаёмая дзяўчына расказала, што вырашыла паваражыць простым спосабам — кінуць бот за веснічкі. Куды насок абутку пакажа — адтуль і жаніха чакаць. Выйшла ўвечары на двор і шпурнула ў цемру бот...

Адразу пасля кідка з вуліцы пачуўся... моцны мужчынскі мацюк. Хлопец, якога яна не заўважыла, ледзь паспеў ухіліцца ад бота, які «прасвісцеў» каля скроні...

Чаго мы яшчэ чакаем ад галоўнага зімовага свята? Што пасля яго наша жыццё абавязкова зменіцца. Мы будзем чуць блізкіх і будзем пачуты імі. Гэта я ўсё пра тую ж даўнюю традыцыю верыць, што цуд — будзе... Галоўнае, каб не атрымалася, як у чарговым анекдоце. «Кожны год перад зімовым святам жонка падносіць мне кулак да носа і заяўляе: "Не будзеш «ужываць» у новым годзе! Не будзеш!» — А я ў адказ усміхаюся і радасна думаю пра сябе: «Столькі ўжо гадоў разам жывём, а колькі ў ёй яшчэ аптымізму!»

Вось! За аптымізм! За веру ў тое, што ў наступным годзе ўсё ў нас будзе добра! Што здзейсняцца ўсе нашы мары і жаданні!

На нашых святочных сталах будуць, пэўна ж, мандарыны і шампанскае, аліўе і заліўная рыба... Але варта прыгатаваць яшчэ адну страву, якая ніколі не будзе лішняй. Трэба ўзяць у пэўных прапорцыях страсці, дадаць кахання, на смак — пацалункаў і абдымкаў. Страву рэкамендуецца паспрабаваць удваіх, лепш за ўсё — у ложку. Можна нават не чакаючы надыходу Новага года.

За веру ў цуды, якія мы можам стварыць самі для сябе і сваіх самых блізкіх!

**Штатны чараўнік «Чырвонкі» Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Я ПА НАТУРЫ БАЕЦ, ТАМУ ЗАЎСЁДЫ ІМКНУСЯ ДАБІЦЦА СВАЙГО»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ»)*

**— Якіх сюрпрызаў чакаць ад вас у фінальным шоу?**

— Зараз мы працуем над характарам песні. Кампазіцыя складаная з пазіцыі вакалу і музычнага суправаджэння, але прыемна назіраць, што ў гледачоў яна выклікае жывую рэакцыю. Плюс — будзе спецыяльны відэарад, дзе праз пэўную пару года (а іх чатыры) мы адлюструем жыццё чалавека. З дапамогай спецэфектаў хочам узмацніць перадачу эмоцый. Акцэнт робім таксама на прафесіяналізм музыкантаў, якія з'явяцца са мной на сцэне. Канцэпцыя нумара ў любым выпадку будзе нязменнай, нейкія карэктывы могуць унесці хіба што тэхнічныя ўмовы самога шоу.

**— Як з'явілася песня «Рапсодыя#1»?**

— Я слухаю шмат добрай музыкі. Тут і адзін з маіх любімых выканаўцаў Джош Гробан, таксама Лучана Паварoці, Дзмітрый Хварастоўскі. Кампазіцыі такога кшталту я лічу больш выйгрышнымі, бо яны дазваляюць мне раскрыцца і вакальна, і эмацыянальна. Свой уплыў аказала і класічная музыка. А калі гаварыць пра змест песні, то я прысвяціў яе маёй жонцы. Калі кажу, што «Рапсодыя#1» жывая, то маю на ўвазе ўкладзеныя ў яе пачуцці, якія мне даводзілася перажыць асабіста.

**Для мяне не існуе такіх паняццяў, як «магу» альбо «не магу», я абавязаны — мая пазіцыя. Такое ж маё стаўленне і да працы.**

**— Вас натхняе каханне?**

— Я шчаслівы чалавек. Хутка стану татам у трэці раз. Як кажуць, трэба дзякаваць Богу, калі ў цябе ўсё добра, а не звяртацца да яго толькі тады, калі дрэнна. У маім жыцці здараліся няўдачы і паражэнні, але не абыходзілася і без перамог. А я па натуры спартсмен і баец, таму заўсёды імкнуся дасягнуць сваіх мэт, наколькі гэта магчыма.

**Здараліся няўдачы і паражэнні, але не абыходзілася і без перамог. А я па натуры спартсмен і баец, таму заўсёды імкнуся дасягнуць сваіх мэт, наколькі гэта магчыма.**

Трэба недзе спыніцца і перачакаць — значыць, праяўляю цярпенне. Ствараючы музыку, імкнуся засяроджвацца на станоўчых момантах. Мне здаецца, такая музыка выклікае больш сімпатыі ў аўдыторыі. Цудоўна ж, што праслухаўшы маю кампазіцыю, нехта захоча падысці і пацалаваць сваю другую «палавінку».

**— Творчы чалавек і дысцыпліна — паняцці сумяшчальныя ў вашым выпадку?**

— Калі казаць пра дысцыпліну, то я імкнуся быць як мага бліжэй да яе. Унутраную арганізаванасць мне даюць заняткі спортам. У мяне ёсць сям'я, і я адчуваю сваю адказнасць перад ёй. Для мяне не існуе такіх паняццяў, як «магу» альбо «не магу», я абавязаны — мая пазіцыя. Такое ж маё стаўленне і да працы. Шоу-бізнес — тая сфера, дзе варта сёння табе адмовіцца — а заўтра пра цябе могуць і не ўспомніць. Таму, праяўляючы недысцыплінаванасць, шкодзіш перш за ўсё самому сабе. Разуменне гэтага прыходзіць з узростам.

**— Складваецца ўражанне, што вы вельмі цвяроза ставіцеся да поспеху. Ці не дастаўляе вам публічнасць дыскамфорту?**

— Думаю, калі чалавек выбірае гэтую сферу, то тая акалічнасць, што яго пазнаюць, успрымаецца як данасць. Ты зрабіў выбар... Адпачыць і пабыць звычайным чалавекам я магу дома, у коле сваёй сям'і. Між тым, не магу сказаць, быццам сёння я настолькі папулярны, што мяне ўсе пазнаюць і ад гэтага мне дыскамфортна. Наадварот, мне прыемна сустрэцца з людзьмі, якія цікавяцца маёй творчасцю, каб пагутарыць з імі ці сфатаграфавацца.

**— Жыццё артыста — гэта жорсткі графік, канцэрты, гастролі. Як успрымаюць родныя вашу працу?**

— Я стараюся знаходзіць час для ўсяго. Для сям'і — у першую чаргу. Ёсць дзень, на які я планую свае працоўныя сустрэчы, здымкі. А на наступны дзень застаюся дома, каб пабыць з блізкімі. Мне важна атрымліваць ад работы радасць і задавальненне, таму буду́ю свой графік так, каб сярод спраў знаходзіць і час для адпачынку.

**— З нараджэннем дзяцей вашы погляды на жыццё і творчасць змяніліся?**

— Сталі зусім іншымі. З упэўненасцю магу сказаць, што я пасталеў і стаў больш адказным. Але адчуваю моцную аддачу любові і пяшчоты у свой адрас. Многае перагледзеў, у тым ліку стала іншым і ўспрыманне прафесіі. Нават у стварэнні музыкі з'явілася новае бачанне.

**— Якім бачыце сябе, скажам, у трыццаць гадоў?**

— Сёння я шчаслівы ва ўсіх адносінах чалавек. Спадзяюся, і праз некалькі гадоў не страціць такога адчування. Таму збіраюся прыкласці для гэтага максімум намаганняў. На кожным жыццёвым этапе — свае задачы. Напрыклад, калі разглядаць мае перспектывы як музыканта, то буду імкнуцца застацца прафесіяналам, які самаўдасканальваецца кожны дзень. Можа, пашчасціць адкрыць нават новыя грані ў сабе і ў сваёй творчасці...

**Алена ДРАПКО.**



ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
Адказныя за выпуск: першы намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА, рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 22.398.
Нумар падпісаны ў 19.30 23.12.2013 г.

# У КАЛЯДЫ НА КАЛЯДЫ


Іосіф ЖУРАЎСКІ на імшы ў даўгінаўскім касцёле.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Чаму ў нашай вёскі такая прыгожая назва? — уваходзячы ў хату, кажа гаспадар. — Таму што на свята заснавалі! Праўда, як даводзілі іншыя, быў тут некалі чалавек па прозвішчы Каляда, але такіх я ўжо не памятаю. Жылі тут спрадвеку Жураўскія, Надольскія, Кур'яновічы, Савіцкія... Жылося ў нас весела. Хадзілі ў госці адно да аднаго, танцавалі польку ў клубе пад акардэон, скрыпачку і цымбалы. Каляды — каталіцкая вёска. У нядзелю ніхто не працаваў, а ўсе земляробчыя работы выконваліся да свят. Цяпер людзей паменшыла. Але жыць нам камфортна. Да нас аўталаўка прыязджае двойчы на тыдзень, пенсію прыносяць своечасова.


Падрыхтоўка каляднага стала ў доме найстарэйшай жыхаркі вёскі — Аляксандры ЛЯШКОВІЧ.


Вясковыя вокны заззялі святочнай ілюмінацыяй.



Знайсці ў вёсцы Тадэвуша ЛЯШКОВІЧА вельмі проста.

Пакуль спадар Іосіф узгадвае польскую школу, войта, які з праверкамі прыязджаў да бацькі, Аляксандра Мікалаеўна завіхаецца каля стала і пералічвае нашаму фотакарэспандэнту ўсё тое, што гатуе на свята Божага Нараджэння. А гэта і поліўка, посны салат з гароху, рыбная страва, кісель — на вігілію, тушаная гусь, каўбаскі пальцам пханыя, сала, вараная лапатка на само свята...


Новая калядная традыцыя ў Калядах — упрыгожваць жывую тую.

Мы крыху адцягваем увагу Жураўскіх ад хатніх клопатаў і выходзім з імі на роўную заасфальтаваную дарогу. З абодвух бакоў ад дарогі стаяць шэрагамі прыгожыя дагледжаныя дамы. Але думкі аб тым, каб пастукаць у дзверы, перапыняе Аляксандра Мікалаеўна — стала ў большасці дамоў ніхто не жыве. Каляды па-сапраўднаму ажываюць летам, калі да нешматлікіх жыхароў прыязджаюць госці, а іншыя хаты запаўняюць дачнікі. Аднак і ў гэты дзень на ўездзе знайшлося некалькі дамоў, запоўненых гасцямі. Да майстравітага гаспадара, пчаляра Тадэвуша Ляшковіча і яго маці прыехалі сваякі з Маладзечна. Саша і Ваня, унукі Тадэвуша, з асалодай упрыгожваюць вокны дома гірляндай агеньчыкаў, у каляднае адзенне «апранаюць» стройную, гожую тую, а пасля бягуць грэцца ў цёплую хату да прабабулі. Пад гарбату яна просіць, каб дасталі старую кніжку, і нешта нетаропка перад ад'ездам расказвае малым. Вось вам і яшчэ адно свята — сямейнае, калі пад адным дахам збіраецца шмат родзічаў.

На развітанне гасцінны Тадэвуш махае рукой і кажа, каб прыязджалі летам, калі людзей будзе больш. І ў гэты момант вельмі хочацца, каб гэтым разам, як калісьці даўно, у святочныя хаты добрых калядцаў вечарам пастукалі сапраўдныя калядоўшчыкі і радасна заспявалі:

*А ўчора з вячора засвяціла зора,*
*Зора засвяціла,*
*Ўвесь свет абудзіла.*
*Нам прыйшла навіна,*
*што Дзева Марыя нарадзіла Сына»*

**Тарас ШЧЫРЫ. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

*Вілейскі раён.*


Калядныя прысмакі Аляксандры ЖУРАЎСКАЙ.

■ Мары збываюцца

# МАМА — ЛЕПШЫ ЦУД



**На дабрачынную калядную акцыю «Нашы сэрцы — хворым дзецям» у Беларускі дзяржаўны тэатр лялек са Слаўгарада, што ў Магілёўскай вобласці, прыехала Ларыса Леанідаўна Ціханава з дваімі прыёмнымі дзецьмі — Машай Гасінай і Уладам Касімавым, з дачкой Настассяй і ўнучкай Юлечкай. Беларускі дзіцячы фонд запрашаў увесь дзіцячы дом сямейнага тыпу Ціханавых, але ж гаспадар, Аляксандр Міхайлавіч, гаспадарку не кіне. Хтосьці з дзяцей зараз на аздараўленні, а іншыя... ужо «выраслі» з карагодаў вакол ёлкі.**

## МОЖНА СТАЦЬ ЧАРАЎНІКОМ

*Акцыя «Нашы сэрцы — хворым дзецям» працягнецца ў краіне да 10 студзеня. Усе ахвотныя могуць стаць чараўнікамі для тых, хто мае патрэбу ў дабрыні і клопаце. Падтрымаць акцыю можна простым пералічэннем грашовых сродкаў на разліковы рахунак* ***БДФ 3015740146011 у ЦБУ №539 ААТ «Белінвестбанк», код 739, УНН 100184002****. Гэтыя грошы неабходны для набыцця навагодніх падарункаў дзецям-сіротам, дзецям-інвалідам, дзецям, якія аказаліся ў святочныя дні на бальнічным ложку.*

*Партнёрамі акцыі ўжо сталі прадпрыемствы «Цэптар Інтэрнацыянал», «Кока-Кола Беўрыджыз Беларусь», «Дыяр-Груп», аб'яднанне «Дыялог Еўразія», валанцёры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, музычны тэатр «Сюрпрыз» Цэнтра пазашкольнай работы «Кантакт» г. Мінска.*

Традыцыйная акцыя Дзіцячага фонду «Нашы сэрцы — хворым дзецям» пачалася ў тэатры лялек, спектаклем «Марозка» і, вядома, падарункамі для 250 дзяцей-сірот з дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, анкалагічна хворых дзяцей і дзяцей, якія перанеслі аперацыі на сэрцы.

Каля высокай святочнай ёлкі бачу знаёмыя твары прыёмных бацькоў... Ведаю, адчуваю, што самы вялікі цуд хаваецца ў іх сэрцах.

Ларыса Леанідаўна назірае, як яе дзеці спрабуюць уліцца ў агульны карагод. Спрабую прарвацца праз дзіцячы натоўп і адвесці яе ў бок, каб параспытваць аб тым, пра што можна гаварыць, у прынцыпе, некалькі сутак без перапынку. З другога боку, навошта марнаваць столькі часу? Паглядзіш у яе вочы — і ўсё становіцца зразумелым: у гэтых вачах бясконцая дабрыня...

Мінае колькі хвілін, і Маша, Насця, Уладзік па чарзе падцягваюцца да мамы. Якой бы чароўнай ні падавалася ёлка, ад яе так проста адарвацца, калі, ідучы ў карагодзе, ты раптам не заўважаеш мамы...

— Я тады працавала дырэктарам школы, — расказвае Ларыса Леанідаўна. — Неяк у райана пачула словы інспектара па апецы: «Сям'я ў нас адна распалася, жонка з'ехала, а бацька не жадае адзін выхоўваць прыёмных дзяцей... Напэўна, вяртаць будзем». Я думаю: як вяртаць? Хіба гэта тавар на гарантыі? І выпаліла: забіраю ўсіх траіх!

У 2001 годзе ў нас з мужам ужо было трое ўласных дзяцей — Мікалай, Максім і Наталля. Плюс трое — пад апекай. Дзіцячыя дамы сямейнага тыпу толькі пачыналі стварацца, а наша мясцовая ўлада падтрымлівала ўсе цікавыя пачынанні... Так мы з мужам пазнаёміліся з Дзіцячым фондам, які актыўна падтрымліваў такую форму выхавання сірот і выдаткоўваў спонсарскія сродкі на набыццё дамоў і бытавой тэхнікі для ахвотных выхоўваць не менш за пяцёра прыёмных дзяцей... Цяпер ужо кагосьці мы паставілі на ногі, выпусцілі ў дарослае жыццё, але сувязь не страчваецца. Старэйшыя добра сябруюць з малымі, дапамагаюць нам на агародзе працаваць. У нас жа ўся асноўная гародніна расце, і яблыні, грушы, ягады ёсць... Ураджай, вядома, пасля справядліва дзеліцца... Дзелім і мяса — парсючкоў, качак, курэй, індыкоў...

Знаёмыя кажуць: «Леанідаўна, у цябе проста дар працаваць з дзецьмі! Трэба помнік паставіць!». Яна толькі смяецца: «Дзе столькі пластыліну возьмеце?».

— Вядома, дапамагае вопыт педагога — дзеці мяне вельмі добра разумеюць... Безумоўна, яны розныя, але калі выхоўваць іх як СВАІХ, то ты проста не здольны падзяляць на «такіх» і «не такіх». Бываюць імгненні, калі хочацца трапіць на бязлюдны востраў... Але скажу шчыра: кожную раніцу прачынаюся шчаслівай. Я не патрабую ад дзяцей больш, чым яны могуць. Заўсёды стаўлю сябе на іх месца. Бывае, нехта правініўся. Я адразу пытаюся: «Як менавіта можна пакараць за такі ўчынак?» Дзеці самі даюць мне адказы на ўсе пытанні, я вучуся жыццю разам з імі...


Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.

Ларыса Леанідаўна гладзіць па валасах кожнага па чарзе і працягвае: «Уладзік у нас вучыцца іграць на акардэоне... Марусечка малюе... Нас кожны год запрашаюць на навагодняе свята, але мы даўнавата не выязджалі. Сёлета неяк удалося».

Да 25 снежня Ціханавы ставяць у доме ёлку. Усе дзеці — Настасся (10 гадоў), Улад (12 гадоў) і Марыя (15 гадоў) Касімавы, Алеся (15 гадоў) і Кацярына (17 гадоў) Елянковы, Марыя Гасіна (12 гадоў) пішуць і кладуць каля зялёнай прыгажуні свае пажаданні для Дзеда Мароза. Праўда, звычайна Дзядуля дорыць што-небудзь для агульнага карыстання: раней гэта быў музычны цэнтр, гульнявая прыстаўка...

У навагоднюю ноч ніхто не пойдзе спаць. На агульны падарунак трэба «папрацаваць» — з'есці «салодкі стол», пачытаць вершы, раздаць маме-тату маляваныя паштоўкі, падаруначкі...

Ларыса Леанідаўна пяшчотна пагладзіць кожнае дзіця па галаве і скажа: «Самы лепшы падарунак для мяне — вашы здароўе і вучоба».

Новы год скончыцца, а самы важны цуд — мама Ларыса і тата Саша — ніколі.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

# Управляющий ОАО «Мозырьдрев» объявляет о проведении торгов по продаже имущества

## Торги проводятся в форме открытого аукциона. Торги состоятся 10 января 2014 года в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Социалистическая, 115.

| № лота | Наименование объекта, краткая характеристика объекта (лота) | Начальная цена продажи, руб. (без уплаты НДС) | Задаток, руб. | Шаг аукциона, % | Затраты на подготовку документации |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 32 | Фрезерный станок ФСШ-1А, инв. № 187 | 7 697 694 | 769 769 | 5 | 1 050 593 |
| Лот № 33 | Универсально-заточной полуавтомат, инв. № 322 | 19 630 512 | 1 963 051 | 5 | 1 050 593 |
| Лот № 34 | Станок заточной для диск.пил с тв. спл. пластинами ВЗ-464, инв. № 173 | 5 000 211 | 500 021 | 5 | 1 050 593 |
| Лот № 35 | Круглопильный станок САС 2500м-1, инв. № 385 | 5 125 216 | 512 522 | 5 | 1 050 593 |
| Лот № 37 | Линия кромкофанирования МОК 4, инв. № 108 | 10 713 129 | 1 071 313 | 5 | 1 050 593 |
| Лот № 38 | Шлифовально-продольно-поперечный станок (италия), инв. № 114 | 15 588 936 | 1 558 894 | 5 | 787 982 |
| Лот № 39 | Фильтр ФКМД-1-1500 м³, инв. № 280 | 1 973 768 | 197 377 | 5 | 1 050 593 |
| Лот № 40 | Фильтр ФКМД-1-2000 м³, инв. № 368 | 2 368 521 | 236 852 | 5 | 1 050 593 |
| Лот № 41 | Ребросклеивающий станок «Купер», инв. № 240 | 7 417 211 | 741 721 | 5 | 1 050 593 |
| Лот № 42 | Круглопильный станок Ц6-2, инв. № 46 | 5 312 724 | 531 272 | 5 | 1 050 593 |
| Лот № 43 | Станок 4-х стор. строг. С-16, инв. № 2197 | 11 376 774 | 1 137 677 | 5 | 1 050 593 |
| Лот № 46 | Сверлильно-гориз. станок, инв. № 58 | 6 316 056 | 631 606 | 5 | 1 050 593 |
| Лот № 47 | Станок зарезки на УС, инв. № 138 | 3 750 158 | 375 016 | 5 | 1 050 593 |
| Лот № 49 | Шлифовальный станок, инв. № 55 | 2 045 225 | 204 523 | 5 | 1 050 593 |
| Лот № 53 | Станок ленточный MG 650011 с лентоподающим механизмом, инв. № 6107 | 19 751 344 | 1 975 134 | 5 | 853 866 |
| Лот № 54 | Компрессор NS 18 S/200, инв. № 469 | 6 003 726 | 600 373 | 5 | 1 050 593 |
| Лот № 58 | Станок токарный, инв. № 168 | 13 038 019 | 1 303 802 | 5 | 1 082 108 |
| Лот № 61 | Аппарат сварочный, инв. № 132 | 2 312 598 | 231 260 | 5 | 1 015 538 |
| Лот № 63 | Сушильный конвейер, инв. № 85 | 16 743 872 | 1 674 387 | 5 | 1 082 108 |
| Лот № 64 | Система пневмотранспорта, инв. № 141 | 902 816 | 90 282 | 5 | 1 082 108 |
| Лот № 65 | Вайма универсальная сборочная, инв. № 145 | 4 573 292 | 457 329 | 5 | 1 082 108 |
| Лот № 66 | Аппарат «Мультиплаз», инв. № 482 | 6 760 519 | 676 052 | 5 | 1 082 108 |
| Лот № 67 | Трансформатор сварочный, инв. № 6761 | 972 263 | 97 226 | 5 | 1 082 108 |
